

Вымярэнне шчасця Нінай Багданавай



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

СТАР. 3



Першае знаёмства з алкаголем у... 9 гадоў

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 МАЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 99 (27709) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПАЧАТАК ВЯЛІКАГА ШЛЯХУ

## Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе Беларусі, Казахстана і Расіі падпісаны ўчора ў Астане. Подпісы пад дакументам паставілі прэзідэнты Аляксандр Лукашэнка, Нурсултан Назарбаеў і Уладзімір Пуцін

**У дагаворы адлюстраваны базавыя аспекты, уласцівыя міжнародным арганізацыям, зафіксаваны прынцыпы суверэннай роўнасці дзяржаў, тэрытарыяльнай цэласнасці. У ім закладзены таксама механізм кансенсусу пры прыняцці рашэнняў на ўсіх узроўнях. Прадугледжаны прынцып роўнай прадстаўленасці бакоў у рамках кадравай палітыкі ў органах Саюза.**

Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе накіраваны на вырашэнне задач па павышэнні дабрабыту і якасці жыцця грамадзян Беларусі, Казахстана і Расіі і прадугледжвае свабоду руху тавараў, паслуг, капіталу і працоўнай сілы, правядзенне скаардынаванай эканамічнай палітыкі. Перспектыўны інтэграцыйны эфект у выглядзе прыросту сукупнага ВУП да 2030 года ацэньваецца ў памеры каля $900 млрд.

Еўразійскі эканамічны саюз фарміруецца на прынцыпах раўнапраўя, мэтазгоднасці, паэтапнасці, прагматызму і ўзаемнай выгады.

Падпісанне дагавора стала галоўным вынікам пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. У ходзе пасяджэння ў вузкім складзе Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь не патрабуе ніякіх уступак у працэсе еўразійскай інтэграцыі, з'яўляючыся разам з Расіяй і Казахстанам удзельнікам раўнапраўнага працэсу. «Не адзін год мы разам ішлі па цярністым шляху еўразійскай інтэграцыі. Кожны крок даваўся няпроста. Але мы заўсёды бачылі галоўную мэту: зрабіць так, каб нашы народы жылі ў міры і дружбе і маглі быць упэўнены, што развіццё і ўмацаванне іх дзяржаў ажыццяўляецца на трывалай аснове ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва», — сказаў беларускі лідар. «Кожны ў інтэграцыю ўносіць нешта такое, што цікава для ўсіх. І гэты ўклад абсалютна не абавязаны вымярацца толькі тонамі, кубаметрамі і барэлямі», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

На пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін адзначыў: «Гэты дакумент выводзіць нашы краіны на прынцыпова новы ўзровень інтэграцыі, у поўнай меры захоўваючы дзяржаўны суверэнітэт. Пры гэтым мы забяспечваем больш цеснае суладнае эканамічнае супрацоўніцтва і кааперацыю», — сказаў Прэзідэнт Расіі. Паводле яго слоў, у краінах «тройкі» існуе развітая прамысловасць, індустрыяльная база, магутны кадравы, інтэлектуальны і культурны патэнцыял, выгаднае геаграфічнае становішча, і гэта — залог канкурэнтаздольнасці аб'яднання, яго дынамічнага развіцця.

«Дагавор накіраваны на вырашэнне задач па павышэнні дабрабыту і якасці жыцця грамадзян нашых дзяржаў. Упэўнены, што стварэнне ЕАЭС стане лепшым стымулам для развіцця ўсебаковай мадэрнізацыі нашых эканомік, вывядзення нашых краін на вядучыя пазіцыі ў свеце», — падкрэсліў Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў.

Пасля падпісання дагавора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Гэта дакумент, са з'яўленнем якога мы звязвалі вялікія надзеі. Беларусь заўсёды займала тут адкрытую пазіцыю, выразна фармулявала свае мэты і задачы ў рамках еўразійскай інтэграцыі. Нашы прыярытэты вядомыя, мы гэта шчыра і сумленна аб'яўлялі, што часам выклікала незадаволенасць у асобных колах нашых дзяржаў».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, улічваючы тую працу, якая была праведзена пры падрыхтоўцы дагавора, у тым ліку на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, Беларусь паставіла свой подпіс пад гэтым глабальным дакументам. «Мы гатовы да паслядоўнага абавязковага руху на шляху поўнай рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых у ходзе вельмі няпростага перамоўнага працэсу, — падкрэсліў беларускі лідар. — Разам з тым неабходна канстатаваць той факт, што рашэнне шэрагу праблемных пытанняў эканамічнага супрацоўніцтва, і перш за ўсё тых, што тычацца ўзаемнага гандлю паміж нашымі дзяржавамі, аднесена на аддаленыя тэрміны».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў важнасць працягу далейшай сумеснай работы па развіцці еўразійскага інтэграцыйнага праекта і выхаду на рэалізацыю ў поўным аб'ёме абвешчаных мэт і задач.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

## 1,5 млрд долараў застанецца ў бюджэце Беларусі

**Беларусь і Расія дамовіліся аб аб'ёмах паставак нафты і новым парадку пералічэння экспартных пошлін на нафтапрадукты. Адпаведныя дакументы падпісаны ўчора ў Астане, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

У прыватнасці, падпісаны Пратакол аб унясенні змяненняў у Пагадненне аб мерах па ўрэгуляванні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў галіне экспарту нафты і нафтапрадуктаў, а таксама Пратакол аб унясенні змяненняў у Пагадненне аб парадку выплаты і залічэння вывазных мытных пошлін пры вывазе з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь за межы мытнай тэрыторыі Мытнага саюза нафты сырой і асобных катэгорый тавараў, выпрацаваных з нафты.

Як растлумачыў журналістам пасля цырымоніі падпісання **намеснік міністра фінансаў Беларусі Дзмітрый КІЙКО,** прадугледжваецца, што ў 2015 годзе ў бюджэт Беларусі будзе залічана $1,5 млрд вывазных мытных пошлін ад экспарту нафтапрадуктаў, выпрацаваных з расійскай нафты. «Да 2015 года, уключаючы 2014 год, такія пералічэнні ў бюджэт Расійскай Федэрацыі Рэспублікай Беларусь ажыццяўляюцца ў поўным аб'ёме. Штогод гэта сума складае ад $3,5 млрд да $4 млрд», — адзначыў ён.

Паводле слоў Дзмітрыя Кійко, дамоўленасць разлічана на доўгатэрміновы перыяд практычна да выхаду на адзіны рынак нафты і нафтапрадуктаў.

Разам з тым Дзмітрый Кійко адзначыў, што задача максімум заключалася ў поўнай адмове ад пералічэння вывазных мытных пошлін на адпаведную прадукцыю ў бюджэт Расійскай Федэрацыі ўжо з 2015 года, што ў прынцыпе і падразумявае эканамічны саюз. «Але, паколькі гэта пытанне вельмі важнае і для Беларусі, і для Расіі, фарміраванне агульнага рынку адкладзена на даволі працяглы тэрмін. Суму $1,5 млрд мы разглядаем як першы этап выхаду на ўзаемаадносіны без гэтых абмежаванняў», — сказаў намеснік міністра.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Валянцін ЧЭКАНАЎ, міністр гандлю:**

***«Прасоўванне тавараў айчынных вытворцаў з'яўляецца прыярытэтам для ўсіх суб'ектаў гандлю на тэрыторыі краіны, у тым ліку і для прадстаўнікоў буйнога рознічнага гандлю. На жаль, не заўсёды на паліцах сеткавых магазінаў прадстаўлены шырокі асартымент беларускай прадукцыі. Недастаткова адводзіцца гандлёвых плошчаў для айчынных тавараў. Беларускі тавар мае добрую якасць. І гэта пацвердзілі госці ЧС-2014 па хакеі. Таму будуць прымацца захады па павелічэнні аб'ёму прадукцыі айчыннай вытворчасці на прылаўках беларускіх аб'ектаў гандлю, у першую чаргу — сталічных».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10080,00 | ▲ |
| Еўра | 13700,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 291,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 847,77 | ▲ |

■ Фестывалім!

# ЗАПРАШАЕ СВЯТА ДЗЯЦІНСТВА

**У Клімавічах стартуе XIV Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка». На чатыры дні райцэнтр ператворыцца ў горад дзяцінства з вясёлымі гульнямі, спевамі, атракцыёнамі.**

Урачыстае адкрыццё свята адбудзецца 30 мая, але першыя яго мерапрыемствы пачаліся напярэдадні.

— Каб паказаць горад ва ўсёй красе, арганізацыі і жыхары прынялі ўдзел у суботніку, — паведаміла намеснік старшыні Клімавіцкага райвыканкама Кацярына Музычэнка. — А з раённага бюджэту на правядзенне свята накіравана 700 мільёнаў рублёў.

У XIV фестывалі прымаюць удзел 29 дэлегацый з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Латвіі, Малдовы, Кыргызстана, Узбекістана, Туркменістана, Кітая, Фінляндыі. Толькі адных дзяцей, непасрэдных удзельнікаў творчых спаборніцтваў, прыбыло звыш 700. Юныя салісты і калектывы пазмагаюцца ў некалькіх намінацыях па спевах, харэаграфіі і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

СТАР. 2




# МІН НЕ БУДЗЕ

**Першая партыя супрацьпяхотных мін, якія захоўваюцца на тэрыторыі нашай краіны яшчэ з часоў СССР, была знішчана ў прысутнасці прадстаўнікоў Міністэрства абароны, Міністэрства замежных спраў Беларусі, Еўрапейскай камісіі.**

Праўда, калі шчыра, усе прысутныя толькі пачулі гук выбуху. Сам працэс знішчэння зброі адбываўся ў спецыяльных памяшканнях новага невялікага прадпрыемства пад Рэчыцай, пабудаванага кампаніяй Expal, якая ажыццяўляла будаўніцтва цэнтра ўтылізацыі супрацьпяхотных мін.

100 тон сталі спатрэбілася для стварэння дэтанацыйнай камеры аб'ёмам 89 кубічных метраў. Для павелічэння супраціўлення ўдарнай хвалі і ціску камера засыпана 136 тонамі пяску. Пабудаваны на тэрыторыі 2271-й базы інжынерных боепрыпасаў цэнтр утылізацыі супрацьпяхотных мін дазволіць знішчаць існуючы запас мін тыпу ПФМ-1 з выкарыстаннем тэхналогіі так званай «халоднай дэтанацыі» — пры дапамозе зарадаў у таўстасценнай бронекамеры. **Кіраўнік праекта іспанскай кампаніі Expal Хаўер Ганзалес Куэста** адзначае, што зроблена ўсё, каб тэхналагічны працэс стаў бяспечным:



— Выключана сама неабходнасць уваходзіць людзям у дэтанацыйную камеру. Падчас ліквідацыі да мін ніхто не дакранаецца — усе працэсы аўтаматызаваны. Трэба выканаць паслядоўна некалькі ўмоў, каб адбыўся выбух, бяспечны для персанала і наваколля. Пасля дэтанацыі запускаецца працэс нейтралізацыі ўтвораных газаў, якія адбываецца таксама пад пільным кантролем. Цвёрдыя адходы, якія ўтвараюцца ў выніку знішчэння жудаснай зброі, уяўляюць сабой кавалкі алюмінію і сталі.

СТАР. 2

■ Надвор'е

# МОКРЫЯ ВЫХАДНЫЯ

**Сёння характар надвор'я ў краіне будзе вызначаць зона паніжанага ціску. Пры гэтым кароткачасовыя дажджы і навальніцы чакаюцца толькі ў асобных раёнах Беларусі, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 16-22 градусы, па паўднёвым усходзе — 23-25 цяпла. Няўстойлівым застанецца надвор'е і ў выхадныя, калі ў многіх раёнах будуць дажджы і навальніцы. У асобных раёнах магчымы град. Месцамі ў нядзелю чакаюцца моцныя дажджы. Пры навальніцах шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Уначы плюс 9-16 градусаў, а ўначы на суботу па паўночным захадзе краіны будзе толькі 6-8 цяпла. Удзень тэмпературны фон пачне павялічвацца да плюс 18-25 градусаў, на захадзе краіны 13-17 цяпла.

І ў пачатку наступнага тыдня захаваецца дажджлівае надвор'е. Мы трапім пад уплыў цёплых і вільготных паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку Чорнага мора. Зноў паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах у панядзелак моцныя ліўні, навальніцы і месцамі магчымы град. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак будзе плюс 10-17 градусаў, а ўдзень чакаецца 19-25 цяпла. Толькі на поўдні заходняга рэгіёна ўдзень — да плюс 13-18 градусаў.

Непрацяглыя дажджы будуць турбаваць нас мінімум да серады. Месцамі магчымы град. Тэмпература паветра ўдзень стане ад плюс 19 цяпла па паўночным захадзе да 27 цяпла па ўсходзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПАН ГІ МУН ГАТОВЫ ВЫСТУПІЦЬ ПАСЯРЭДНІКАМ ВА ЎРЭГУЛЯВАННІ КРЫЗІСУ ВА УКРАІНЕ

Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун асабіста ўключыўся ва ўрэгуляванне ўкраінскага крызісу і падтрымлівае пастаянную сувязь з расійскім і ўкраінскім кіраўніцтвам. Пра гэта карэспандэнту ІТАР-ТАСС заявіў афіцыйны прадстаўнік генеральнага сакратара Стэфан Дзюжарык, каментуючы прапанову РФ неадкладна падключыць Пан Гі Муна да намаганняў па спыненні насілля на ўсходзе Украіны.

Як паведаміў Дзюжарык, ААН ужо ўцягнутая ў гэтыя намаганні праз сваю місію па назіранні за сітуацыяй з правамі чалавека, а таксама праз прадстаўніцтва сусветнай арганізацыі, якое дзейнічае ў краіне. «Як ён [Пан Гі Мун] ужо заяўляў у мінулым, яго пасрэдніцкія паслугі заўсёды даступныя», — сказаў афіцыйны прадстаўнік генеральнага сакратара. З прапановай неадкладна падключыць кіраўніка ААН, каб дамагчыся спынення насілля на ўсходзе Украіны, у сераду на пасяджэнні Савета Бяспекі выступіў пастаянны прадстаўнік РФ пры ААН Віталь Чуркін.



### СЕРБІЯ ВЯРТАЕЦЦА ДА НАРМАЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Між тым урон ад паводкі ў краіне складае каля 1 млрд еўра. Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр краіны Аляксандар Вучыч у інтэрв'ю нацыянальнай тэлерадыёкампаніі РТС.

Дапамога з-за мяжы зможа пакрыць каля 20% страт, адзначыў ён. Паводле слоў Вучыча, сітуацыя ў затопленых раёнах паляпшаецца, урад склаў план па аднаўленні пасля стыхійнага бедства. «Усе, у каго разбураны дамы, атрымаюць новае жыллё», — паабяцаў прэм'ер. Ён таксама запэўніў, што дзяржава возьме на сябе аднаўленне дарог як рэспубліканскага, так і мясцовага значэння, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні муніцыпалітэтаў. Таксама будзе праводзіцца аднаўленне энергасістэмы. Па словах прэм'ера, дзяржава дапаможа фермерам, даўшы ім насенне, угнаенні, а таксама часткова пакрые шкоду за гібель жывёл. «Усё, што важна для жыцця, дзяржава адновіць», — запэўніў ён. У Сербіі 38 чалавек лічацца прапаўшымі без вестак у выніку паводкі. Паводле слоў прэм'ера, колькасць загінулых у выніку стыхійнага бедства па-ранейшаму складае 33 чалавекі.

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У БРУСЕЛІ ВЫРАШЫЛІ ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ ПАЛІТЫКУ ЕЎРАСАЮЗА




Лідары Еўрасаюза дамовіліся аб пераглядзе сваёй палітыкі ў розных галінах, пасля таго як многія выбаршчыкі на выбарах у Еўрапарламент прагаласавалі за правыя партыі.

Прэзідэнт Еўрапейскага Савета Херман Ван Рампей заявіў, што лідары 28 краін — членаў ЕС папрасілі яго пачаць кансультацыі аб будучых зменах. Ван Рампей выступіў з гэтай заявай пасля сустрэчы ў Бруселі, на якой абмяркоўваліся вынікі парламенцкіх выбараў у ЕС. Падрабязнасцяў з гэтай нагоды пакуль вядома няшмат, аднак больш за ўсё незадаволенасці сярод жыхароў Еўрасаюза выклікае празмерная бюракратызацыя і багацце разнастайных дырэктыў з Бруселя. Таксама мала энтузіязму ў жыхароў шэрагу краін ЕС з нагоды ўведзеных уладамі мер строгай эканоміі. Менавіта на гэта, хутчэй за ўсё, паводле слоў экспертаў, палітыкі перш за ўсё і звернуць сваю ўвагу ў ходзе абмеркавання рэформаў, каб улічыць інтарэсы выбаршчыкаў.

### КОРАТКА

Прэзідэнт Беларусі сваім указам заснаваў юбілейны медаль «110 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі», а таксама зацвердзіў палажэнне аб медалі, яго апісанне і ўзор пасведчання.

Гарадское свята «Шчаслівая ўсмешка дзяцінства», прысвечанае Міжнароднаму дню абароны дзяцей, адбудзецца ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі 30 мая. Каля Палаца дзяцей і моладзі ў гэты дзень выступяць творчыя калектывы, будуць працаваць разнастайныя інтэрактыўныя пляцоўкі. Завершыцца свята воднай феерыяй на беразе Камсамольскага возера.

Прадстаўнікі фінскай кампаніі Leipurin OY плануюць адкрыць у Мінску вучэбны цэнтр, на базе якога будуць арганізаваны майстар-класы па вырабе жытніх гатункаў хлеба, кандытарскіх вырабаў на аснове беларускай сыравіны з выкарыстаннем фінскіх тэхналогій.

Нацыянальны аэрапорт «Мінск» стаў пераможцам конкурсу «Лепшы аэрапорт краін СНД» па выніках работы за 2013 год.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «БО ЯНА ПРЫХОДЗІЦЬ АМАЛЬ КОЖНЫ ДЗЕНЬ»

**Святлана ЧАРНЯЎСКАЯ, урач-педыятар 10-й дзіцячай гарадской клінічнай паліклінікі г. Мінска.**



— Я — мінчанка, нарадзілася ў сярэдзіне мінулага стагоддзя і, магчыма, як многія тады, навучылася чытаць менавіта па «Звяздзе», якую атрымлівалі бацькі. Сама стала падпісчыцай газеты гадоў трыццаць таму.

Цяпер на мой адрас прыходзіць сем выданняў. Пры тым, што яшчэ працую, часам не паспяваю прачытаць усё — нешта адкладваю на потым. А вось «Звязду» чытаю заўсёды і першай. Да таго толькі яна прыходзіць пяць разоў на тыдзень, астатнія — раз ці два на тыдзень.

За што я люблю «Звязду»? Галоўнае: яна робіцца з любоўю да чытача — а значыць, і да мяне. Гэта — па першае. Па-другое, няма ў краіне іншай газеты, якая б так паслядоўна змагалася за беларускую мову. І не проста лозунгамі — выступленнямі навукоўцаў і пісьменнікаў, «круглымі сталамі», лістамі чытачоў ды і самой саёй мовай. Па-трэцяе, ці не кожны звяздоўскі артыкул мае нейкую дадатную энергетыку, чытаецца лёгка — ад загалоўка да подпісу і вымушае то задумацца, то нешта ўспомніць, то ад душы пасмяяцца, а то і паплакаць.

Падабаецца, як газета асвятляе пытанні аховы здароўя, заўсёды чакаю выпуску тэматычных старонак «Жырандоля», «Ігуменскі тракт». Па просьбе майго (светлай памяці!) мужа Міхася Чарняўскага, гісторыка, археолага і пісьменніка, я падбірала звяздоўскія артыкулы па гісторыі, мове, культурнай спадчыне — атрымалася добрая папка. А потым — і другая: з «Хатняй энцыклапедыі», «Крынічкі», з «...Народа на провадзе!».

...Часам, праўда, злуюся на вялікую колькасць рэкламы, але і разумею, што сёння гэта сродак зарабляць грошы.

**Запісала Валянціна ДОЎНАР.**

**P.S.** ***Вы таксама «зноў выбіраеце «Звязду»? І хацелі б расказаць, чаму? Тады пішыце, дасылайце сваю фатаграфію. Самыя цікавыя лісты будуць надрукаваны.***

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

**Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал 2014 года!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 57 000 | 171 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 51 300 | 153 900 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 125 000 | 375 000 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 112 500 | 337 500 |

# ПАЧАТАК ВЯЛІКАГА ШЛЯХУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Падпісанне сённяшняга дагавора — гэта не заканчэнне, а толькі пачатак сур'ёзнага працэсу, калі мы і самі сабе, і ўсяму свету абавязаны даказаць, перш за ўсё сваім народам, што мы зрабілі правільныя крокі ў гэтым кірунку», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. «Каб тыя пытанні, з якімі мы сутыкнуліся і адразу не змаглі вырашыць, вырашыліся ў будучыні, мы заяўляем, што крокі па пабудове Еўразійскага эканамічнага саюза павінны быць увязаны з вырашэннем пытанняў, якія аказваюць значнае ўздзеянне на ўзаемны гандаль дзяржаў — членаў гэтага саюза. Мы верым, што эканамічны саюз стане асновай у будучыні нашага палітычнага, ваеннага і гуманітарнага адзінства», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы аб далейшых перспектывах развіцця еўразійскай інтэграцыі, кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што працэс фарміравання Мытнага саюза, АЭП і цяпер Еўразійскага эканамічнага саюза быў доўгім і вельмі складаным. «Кагосьці мы гублялі на гэтым шляху. Я маю на ўвазе Украіну часоў Кучмы, якая таксама пачынала з намі гэтую цяжкую працу. На жаль, ноша аказалася вельмі цяжкай для Украіны», — адзначыў беларускі лідар. — Але я ўпэўнены, што рана ці позна кіраўніцтва Украіны зразумее, дзе ляжыць яе шчасце. Прынамсі, не будзе губляць тое, што па праве павінна належаць украінскага народу».

«Кагосьці мы знаходзілі на гэтым доўгім і нялёгкім шляху, як нашых сяброў і братоў з Арменіі, Кыргызстана. Усякае было за гэтыя дзесяцігоддзі, але мы, не спыняючыся, ішлі наперад, верылі ў будучыню», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Ва ўрадзе

# ЧЭМПІЯНАТ ЯК АДКРЫЦЦЁ

## На краіну свежымі вачыма паглядзелі не толькі турысты, але і самі беларусы

**Рэкорд наведвання матчаў, сёмае месца айчыннай зборнай, шчырая цікавасць да беларускіх славутасцяў... Гэта толькі частка вынікаў праведзенага сусветнага першынства па хакеі. Учора ў Савеце Міністраў на апошнім пасяджэнні арганізацыйнага камітэта па правядзенні чэмпіянату свету падлічылі выгады.**

### Нацыянальнае свята

**Прэм'ер-міністр Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** нагадаў, што падрыхтоўка да спаборніцтва цягнулася 5 гадоў. «І мы цяпер пасля ўсяго можам сказаць, што нашай краіне па сілах вырашаць самыя складаныя і адказныя задачы. Гэта была тонкая праца. Трэба было дагадзіць усім гасцям, і зрабіць гэта карэктна. Я думаю, што мы можам прэтэндаваць на правядзенне і іншых буйных міжнародных мерапрыемстваў», — заявіў прэм'ер. Кіраўнік урада звярнуў увагу на тое, што за ўвесь час не заўважыў ніводнага абыякавага чалавека: «Гэта быў сапраўдны пад'ём — эмацыянальны і патрыятычны».

Той жа думкі прытрымліваецца **намеснік прэм'ер-міністра Анатоль ТОЗІК:** «Мы сталі іншымі. Я лічу, што чэмпіянат значна паўплываў на нашу моладзь, на іх патрыятычную свядомасць. Мы ўбачылі, што жыхары тых краін, якія мы лічым узорам развіцця, захапляліся нашай краінай». Для падтрымання патрыятычнага настрою віцэ-прэм'ер прапанаваў выкарыстоўваць дзяржаўную сімволіку ў паўсядзённым жыцці больш шырока.

Патрыятычны ўздым адзначыў і **Яўген ВОРСІН, старшыня Федэрацыі хакея Беларусі, кіраўнік Дырэкцыі па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі з шайбай**: «Прыемна, што гэты чэмпіянат ператварыўся ў сапраўднае нацыянальнае свята. Як мінімум на гэтыя дні нашай нацыянальнай ідэяй стала ідэя спорту».

### Добра частаваліся

Сваю ацэнку даў **міністр гандлю Валянцін ЧЭКАНАЎ**: «Гандаль, грамадскае харчаванне і бытавое абслугоўванне спрацавалі, на наш погляд, вельмі добра. У пяці фан-зонах нагандлявалі на 47 млрд рублёў. Было выпіта 420 тысяч літраў беларускага піва. Таксама было прададзена вельмі шмат беларускіх сувеніраў». Дарэчы, асаблівым попытам, па словах міністра, карыстаецца сувенірная прадукцыя, якая з'явілася ў продажы пасля заканчэння спаборніцтва. «Такое ўражанне, што людзі спецыяльна засталіся, каб дакупіць нашых сувеніраў, бо мы з лютага імі не гандлявалі. Мы нават заказалі дадатковыя партыі», — паведаміў Валянцін Чэканаў.

Анатоль Тозік таксама прывёў некалькі фактаў. Напрыклад, пра рэкорд па наведванні матчаў: усяго на 64 гульнях чэмпіянату пабывалі 651 314 заўзятараў. Паводле слоў віцэ-прэм'ера, апраўдала сябе і ўвядзенне бязвізавага рэжыму. Агульная колькасць замежных турыстаў, гасцей і ўдзельнікаў чэмпіянату — больш за 80 тысяч чалавек. Цікава, што госці наведвалі не толькі хакейныя матчы, але і бавілі час у экскурсіях па беларускіх славутасцях. Так, падчас чэмпіянату Брэсцкую крэпасць наведала ў 4,5 раза больш турыстаў, чым у аналагічны перыяд мінулага года. Наведванне замкавага комплексу «Мір» вырасла ў 3,6 раза, музея-запаведніка «Нясвіж» — у 3,2 раза. Пасля такіх вандровак турысты і добра елі. «Штодзень у зонах гасціннасці прадавалася больш за 300 кг дранікаў са смятанай. Практычна кожны госць чэмпіянату пакаштаваў гэтую нацыянальную страву», — паведаміў Анатоль Тозік.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

# ЗАПРАШАЕ СВЯТА ДЗЯЦІНСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прысуд іх таленту вынесе кампетэнтнае міжнароднае журы, у склад якога ўваходзяць народны артыст Беларусі, прафесар кафедры харавога дырыжыравання Беларускай акадэміі музыкі Міхаіл Дрынеўскі, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра музычных мастацтваў імя Уладзіміра Мулявіна Святлана Стацэнка, армянская прыма-балерына Жаклін Сархашан. Хто стане ўладальнікам гран-пры і атрымае спецыяльныя дыпломы фестывалю, стане вядома 1 чэрвеня, падчас закрыцця фэсту.

Уражвае і вялікая забаўляльная праграма, якая чакае наведвальнікаў свята. Кожны дзень у краіне дзяцінства будзе праходзіць пад асобным тэматычным знакам — «Дзень беларускай гасціннасці», «Дзень дружбы», «Дзень замежных культур» і «Дзень дзяцінства». Цэнтрам жыцця стане гарадскі парк, дзе на працягу ўсяго фестывалю будуць адначасова працаваць розныя гульнявыя і творчыя пляцоўкі. Тут адбудуцца сустрэчы з артыстамі Клімаўшчыны і Магілёўшчыны, дэгустацыі розных страў, майстар-класы ад рамеснікаў, выставы-продажы сувеніраў, зробленых рукамі народных умельцаў і выхаванцаў сярэдне-спецыяльных устаноў вобласці, адкрыюцца тэатральна-фальклорныя экспазіцыі. Ёсць магчымасць наведаць алею «Батлейка», дзе народныя лялечныя тэатры прадэманструюць прадстаўнікі Магілёва і 4 раёнаў вобласці. Упершыню ў Клімавічах пройдзе модны праект «Сушка» з абменам фотаздымкамі. Шмат станоўчых эмоцый падораць догшоу, конкурс дзіцячага малюнка на асфальце, спартыўнае свята, шоу «Міс Залатая пчолка». І якое свята дзяцінства без мульцікаў і марожанага?! У парку запрацуе перасовачны кінатэатр, а адзін са спонсараў фестывалю — Магілёўская фабрыка марожанага — зробіць смачнае свята, дзе можна будзе бясплатна паласавацца яго прадукцыяй.

Чатырнаццаты фестываль «Залатая пчолка» праходзіць пад знакам Года гасціннасці і 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І асобны блок у ім прысвечаны абаронцам Айчыны. Свае навыкі прадэманструюць байцы спецназа, вельмі відовішчным абяцае быць дэфіле аркестра Узброеных Сіл Беларусі і яго канцэрт. Апафеозам свята стане авіяшоу, падчас якога парашутысты будуць прызямляцца са сцягамі краін-удзельніц. А ў канцы відовішча ў паветры разгорнецца сцяг Беларусі плошчай 700 кв.м. Святочны феерверк арганізатары запланавалі на дзень адкрыцця фестывалю, а ў Міжнародны дзень абароны дзяцінства адбудзецца маляўнічае шэсце «Квітней, дзяцінства, на планеце».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Разам мы мацнейшыя

# АБ'ЯДНАЦЦА, КАБ ПЕРАМАГАЦЬ

## КРАІНЫ САДРУЖНАСЦІ АДРАДЖАЮЦЬ САМАБЫТНЫ СПОРТ І ЗАДАЮЦЬ МОДУ НА ЗДАРОЎЕ

**Нагоды для размовы з начальнікам аддзела па супрацоўніцтве ў галіне культуры, спорту, турызму і моладзі Выканаўчага камітэта СНД Таццянай КАВАЛЁВАЙ дзве — сённяшняе пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў Садружнасці ў Мінску і паспяховае правядзенне ў сталіцы Беларусі спартыўнага турніру сусветнага маштабу, настрой якога яшчэ адчуваецца ў паветры...**



***— Таццяна Мікалаеўна, прыемна было, калі новыя чэмпіёны свету па хакеі сведчылі пра дамашнюю атмасферу, у якой адбываўся чэмпіянат... Гэта павінна быць вынікам добрых стасункаў паміж краінамі. Для будучых спартыўных перамог важна тое, што робяць члены Садружнасці ў сферы спорту...***

— Сапраўды, у дні чэмпіянату свету па хакеі Мінск нават для нас, мінчан, стаў асаблівым горадам. Паўсюль гучала замежная гаворка, яркае адзенне балельшчыкаў стварала атмасферу свята, агульныя эмоцыі і захапленне разнамоўных аматараў спорту і проста цікаўных пры праглядзе хакейных матчаў у кавярнях і ля манітораў... Усё гэта яшчэ раз нагадвала вызначэнне спорту родапачынальнікам сучаснага алімпійскага руху П'ерам дэ Кубертэнам «О, спорт! Ты — мір, прагрэс, радасць, справядлівасць, выклік, высакароднасць, асалода, дойлід, плённасць».

**Пры гэтым галоўная задача — садзейнічаць даступнасці заняткамі спортам шырокім пластам насельніцтва і такім чынам павялічыць лік грамадзян краін Садружнасці, якія вядуць здаровы лад жыцця.**

Таму невыпадкова сярод асноўных задач гуманітарнага супрацоўніцтва ў СНД, якое разглядаецца як самы важны элемент узаемадзеяння, бо дазваляе ў максімальным аб'ёме задзейнічаць чалавечы фактар у міждзяржаўных адносінах, — развіццё спорту. Гэта прадугледжвае Канцэпцыя далейшага развіцця Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

***— Два гады таму была ўхвалена Стратэгія развіцця фізічнай культуры і спорту дзяржаў — удзельніц СНД да 2020 года. Які змест гэтага дакумента?***

— Стратэгія — прафесійны дакумент, які адлюстроўвае асноўныя тэндэнцыі ў сферы фізкультуры і спорту ў дзяржавах. Ён раскрывае ўвесь спектр супрацоўніцтва па развіцці фізкультурна-масавага руху, спорту вышэйшых дасягненняў, аматарскага, прафесійнага, дзіцяча-юнацкага і студэнцкага спорту. Вялікая ўвага нададзена нацыянальным відам спорту, адаптыўнай фізічнай культуры і спорту, алімпійскаму і паралімпійскаму руху. У дакуменце сфармуляваны таксама ключавыя аспекты фарміравання і функцыянавання аб'ектаў спартыўнай інфраструктуры, правядзенні спартыўных мерапрыемстваў, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў у гэтай сферы, узаемадзеянні з вытворцамі і пастаўшчыкамі спартыўных тавараў і паслуг.

Галоўная задача гэтага дакумента — садзейнічаць даступнасці заняткамі спортам шырокім пластам насельніцтва і такім чынам павялічыць лік грамадзян краін Садружнасці, якія вядуць здаровы лад жыцця. Менавіта гэтая праблема будзе ў цэнтры абмеркавання спецыялістаў розных галін на штогадовым Міждзяржаўным форуме «Здароўе насельніцтва — аснова росквіту краін Садружнасці», які сёлета пройдзе ў чэрвені ў Маскве.

Заканамерна, што план па рэалізацыі Стратэгіі на 2013-2015 гады, таксама зацверджаны саветам кіраўнікоў урадаў СНД, стварае рэальныя магчымасці для выканання пастаўленай задачы. Шмат мерапрыемстваў для дзяцей і юнацтва. Напрыклад, міжнародныя дзіцячыя гульні «Спорт. Мастацтва. Інтэлект», якія прайшлі летась, сабралі больш за тры тысячы ўдзельнікаў. Вялікую папулярнасць набывае фестываль школьнага спорту дзяржаў — удзельніц СНД (ён прадугледжвае змаганне менавіта школьных каманд). Шэраг фізкультурна-спартыўных мерапрыемстваў накіраваны на прыцягненне людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Прымаюцца меры па аб'яднанні намаганняў у развіцці спорту вышэйшых дасягненняў, у тым ліку правядзенне сумесных навучальна-трэніровачных збораў. План мае мэтай сумесную працу па стварэнні канцэпцыі сацыяльнай і прафесійнай адаптацыі спартсменаў, якія скончылі прафесійную дзейнасць. Мяркуецца правядзенне сумесных канферэнцый і семінараў па допінг-кантролі. Сёлета плануецца правядзенне нарады рэктараў ВНУ фізічнай культуры і навуковых арганізацый у вобласці спорту дзяржаў Садружнасці. Асаблівая ўвага надаецца падтрымцы і развіццю нацыянальных відаў спорту. У тым ліку мяркуецца правядзенне фестывалю нацыянальных відаў спорту дзяржаў — удзельніц СНД.

Савет па фізічнай культуры і спорту дзяржаў Садружнасці на кожным сваім пасяджэнні грунтоўна абмяркоўвае, як рэалізуюцца Стратэгія і адпаведны план у краінах СНД.

***— Наколькі гатова Праграма падтрымкі і развіцця нацыянальных відаў спорту ў СНД? Пра якія, дарэчы, віды спорту ідзе гаворка?***

— Праграма і план мерапрыемстваў па яе рэалізацыі прайшлі экспертную прапрацоўку, унутрыдзяржаўнае ўзгадненне і ўхвалены на пасяджэнні Савета міністраў замежных спраў СНД 4 красавіка гэтага года ў Маскве. Пытанне аб іх зацвярджэнні будзе разгледжана на пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў СНД 30 мая ў Мінску.

Нацыянальныя віды спорту маюць шматвяковую гісторыю. І ў гэтым сэнсе іх захаванне і развіццё мае агульнакультурнае значэнне і адпавядае прыярытэтам гуманітарнага супрацоўніцтва ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Асноўнымі мэтамі згаданых дакументаў з'яўляюцца актыўнае садзейнічанне стварэнню ўмоў для развіцця існуючых і адраджэнню страчаных нацыянальных відаў спорту, а таксама павелічэнне колькасці людзей, якія імі займаюцца. Думаю, калі даць поўны пералік відаў спорту, пра якія ідзе гаворка ў праграме, адкрыецца шмат новага.

Нароўні з шырока вядомымі відамі спорту, такімі як нарды, зархана, кох, руская лапта, гарадошны спорт, самба і іншыя, да нацыянальных відаў спорту, напрыклад, адносяць у Азербайджане пехлеван гюлешы (барацьба, якая праходзіць у музычным суправаджэнні) і дзірэдэйме (гульня з рэменем), у Арменіі тракрыў (фехтаванне шаблямі) і маканахах (гульня з мячом і клюшкамі), у Казахстане саятшылык (паляванне з лоўчымі птушкамі) і жамбы ату (стральба з лука), тыйын энмей (гульня вершнікаў, падыманне манеты на скаку) і ардо (гульня ў альчыкі — ігральныя косткі), у Расіі хапсагай (від спартыўнага адзінаборства) і якуцкія нацыянальныя скачкі, у Таджыкістане турніры па гушцінгіры (від спартыўнага адзінаборства) і куваі базі (аналаг армрэслінга)...

**Нацыянальныя віды спорту маюць шматвяковую гісторыю. І ў гэтым сэнсе іх захаванне і развіццё мае агульнакультурнае значэнне і адпавядае прыярытэтам гуманітарнага супрацоўніцтва ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**

Праграма і план прадугледжваюць арганізацыю і правядзенне ў рамках СНД стажыровак, абменаў, маладзёжных фізкультурна-аздараўленчых лагераў, міжнародных спартыўных экспедыцый, сустрэч ветэранаў спорту. Заняткі нацыянальнымі відамі спорту прапануецца ўключыць у праграмы ўсіх узроўняў выхавання і адукацыі. Плануецца таксама арганізацыя падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў па нацыянальных відах спорту і сістэмы іх навукова-інфармацыйнага забеспячэння.

***— Ці маюць працяг ідэі, народжаныя ў 2012 годзе — Годзе спорту і здаровага ладу жыцця Садружнасці?***

— Безумоўна. Напрыклад, той жа фестываль школьнага спорту, ідэя правядзення якога нарадзілася ў 2012 годзе, сёння набірае абароты яркага спартыўнага мерапрыемства, і ёсць упэўненасць, што ён стане новай традыцыяй у Садружнасці. Летась школьнікам былі прадастаўлены лепшыя пляцоўкі горада Казані, пабудаваныя для Сусветнай летняй універсіяды. Фэст — гэта не толькі спаборніцтвы па міні-футболе, валейболе, настольным тэнісе, бадмінтоне, шахматах, баскетболе і нават фітнес-аэробіцы, але і выдатныя экскурсіі, сустрэчы са знакамітымі спартсменамі, дыскатэкі і шмат іншага, што стварае добры настрой, дапамагае знайсці новых сяброў, больш даведацца пра спорт.

І галоўнае, тыя дакументы, якія аб'ядналі дзяржавы — удзельніцы СНД (стратэгія супрацоўніцтва, Праграма падтрымкі нацыянальных відаў спорту) — сталі рэальнасцю дзякуючы актыўнай сумеснай працы спецыялістаў і чыноўнікаў у Год спорту і здаровага ладу жыцця.

***— Якія цікавыя мерапрыемствы ў гэтай сферы можна чакаць у бліжэйшы час?***

— У чэрвені адбудзецца пасяджэнне Савета па фізічнай культуры і спорту ў Чалпон-Аце. На парадку дня, у прыватнасці, пытанне пра супрацоўніцтва з аргкамітэтам маладзёжных спартыўных гульняў, якія ўжо на працягу 17 гадоў з вялікім поспехам праходзяць у Харватыі.

На форуме «Здароўе насельніцтва — аснова росквіту краін Садружнасці» ў Маскве прадстаўнікі СНД абмяркуюць пытанні фізічнай культуры і масавага спорту як асновы здароўезберагальных тэхналогій. Будуць таксама абмяркоўвацца праблемы допінгу ў спорце, умацавання здароўя дзяцей у сістэме адукацыі, сацыяльнай рэкламы здаровага ладу жыцця і іншыя пытанні.

На летні перыяд, як заўсёды, запланаваны шэраг аздараўленчых і спартыўных лагераў, маладзёжных спаборніцтваў. Напрыклад, у беларускім лагеры «Зубраня» з 6 па 14 чэрвеня пройдзе міжнародны маладзёжны форум «Сяброўства без межаў», падчас якога будуць праведзены спартыўныя спаборніцтвы і забавы.

Выканаўчы камітэт СНД прыняў рашэнне аб заснаванні спецыяльнага прыза для арганізатараў спорту, якія зрабілі асаблівы ўнёсак у развіццё супрацоўніцтва ў гэтай сферы на прасторы СНД. Прыз мяркуецца ўручаць падчас ужо традыцыйнага міжнароднага турніру па футболе «Кубак Садружнасці».

Прынятыя ў рамках СНД праграмныя дакументы настройваюць спартыўныя ведамствы нашых дзяржаў і Выканкам СНД на пастаяннае супрацоўніцтва па іх рэалізацыі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

■ АПК: праблемы і рашэнні

# НАСТУПАЕМ НА НЯСПРАЎНЫЯ ГРАБЛІ

**Апошнім часам шмат гаворыцца пра неабходнасць строгага захавання тэхналогіі, аптымальных тэрмінаў сельгасработ як найпершыя ўмовы паспяховасці АПК. Але прыходзіць сезон той ці іншай работы — і зноў наступаем на леташнія граблі, прычым як у пераносным сэнсе, так і ў прамым.**

Пачаўся сезон нарыхтоўкі кармоў, а матарызаваныя граблі ў многіх не гатовы да работы і стаяць на мехдварах. У гэтым пераканаліся спецыялісты Дзяржкантролю падчас маніторынгу ў гаспадарках Маларыцкага і Брэсцкага раёнаў. Так, у сельгаспрадпрыемстве «За мір» Брэсцкага раёна з трох наяўных грабель былі задзейнічаны толькі адны. Двое іншых аказаліся няспраўнымі. З дзвюх касілак працавала толькі адна, з трох прэспадборшчыкаў у поле выйшаў адзін. Траву касіў адзін камбайн, другі быў у рамонце. Тлумачэнне ў спецыялістаў і кіраўнікоў такое: рамонт зацягнуўся з прычыны недахопу грошай. Але ж зразумела, што правесці якасна і ў аптымальныя тэрміны нарыхтоўку кармоў з паловай тэхнікі практычна немагчыма.

Як і нельга паўнацэнна правесці зімоўку грамадскага статку з абы-якімі кармамі. А ў гаспадарках «Чырвоны партызан», «Ляхаўцы» Маларыцкага раёна ды і некаторых іх суседзяў з Брэсцкага раёна сянажную масу клалі ў ямы недастаткова здробненую, не вытрымліваўся тэмпературны рэжым закладкі і вільготнасць. Усё гэта, паводле слоў **начальніка ўпраўлення КДК Брэсцкай вобласці Аляксея ДЗМІТРУКА,** адаб'ецца на якасці кармоў і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі.

Вось так: гаворым аб неабходнасці павышэння эфектыўнасці аграпрамысловага комплексу, а да работы падыходзім па-старому: спраўнасць тэхнікі своечасова не падтрымліваем, тэхналогію не захоўваем. Праўда, пакуль ёсць час выправіць сітуацыю. У цэлым на Брэстчыне нарыхтавана толькі каля 15% сенажу, а сіласу і сена — 0,8 і 1,7 працэнта адпаведна. І як паказвае практыка, тыя гаспадаркі, што маюць добрыя вынікі ў жывёлагадоўлі, знаходзяць грошы на рамонт кормаўборачнай тэхнікі і вельмі адказна ставяцца да якасці сена і вільготнай травяной масы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

# МІН НЕ БУДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Работа аб'екта па знішчэнні мін арганізавана ў тры змены, шэсць дзён на тыдзень. За дзень тут могуць утылізаваць 8 тысяч снарадаў. Францыска Тарэнтэ, старшыня савета дырэктараў іспанскай кампаніі Expal — распрацоўшчыка цэнтра ўтылізацыі супрацьпяхотных мін, гаворыць, што міны, якія трэба ўтылізаваць тут, адрозніваюцца ад тых, якія іх кампанія ўтылізавала раней:

— Яны змяшчаюць вадкасць — для нас гэта было незвычайным. Таму нашым тэхнікам прыйшлося знайсці новы працэс, які цалкам утылізаваў бы такія снарады.

Такі тып зброі лічыцца адным з самых небяспечных і негуманных у свеце — размініраваць вельмі складана, таму пакутуюць галоўным чынам мірныя жыхары. Нават захоўваць фугасныя міны на складах небяспечна, гавораць спецыялісты. Яны прымяняюцца дыстанцыйна і выклікаюць вялікія цяжкасці пры пошуку, адзначае **начальнік інжынерных войскаў Узброеных Сіл — начальнік упраўлення інжынерных войскаў Генеральнага штаба Узброеных Сіл Андрэй КУРАКОЎ.**

Трэба дадаць, што Беларусь далучылася да Атаўскай канвенцыі аб забароне прымянення, збірання запасаў, вытворчасці і перадачы супрацьпяхотных мін і аб іх знішчэнні ў 2003 годзе. Наша краіна выступае за няўхільнае выкананне канвенцыі ўсімі дзяржавамі, якія яе падпісалі, і пашырэнне кола краін, гатовых актыўна супрацоўнічаць у пытаннях міннай праблематыкі.

— Рэалізацыя праекта дазволіць цалкам выканаць міжнародныя абавязацельствы Беларусі ў гэтай сферы, — падкрэслівае намеснік міністра абароны па ўзбраенні — **начальнік узбраення Узброеных Сіл генерал-маёр Ігар ЛАЦЯНКОЎ.** — У Беларусі звыш 3 мільёнаў 300 тысяч мін тыпу ПФМ-1, якія пакуль знаходзяцца на захоўванні ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь. Цяпер мы ўступілі ў фазу практычнай рэалізацыі праекта з дапамогай фінансавання Еўрапейскага саюза.

Рэалізацыя праекта пачалася яшчэ восенню 2007 года, калі на фінансаванне праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Ліквідацыя боепрыпасаў, якія змяшчаюць міны тыпу ПФМ-1, у Беларусі», Еўрапейскай камісіяй было выдаткавана 4 000 000 еўра. Плануецца, што ў канцы ліпеня прадпрыемства выйдзе на спраектаваную вытворчую магутнасць. Каля 20 месяцаў спатрэбіцца, каб у Беларусі ліквідаваць усе міны такога тыпу. Дарэчы, абсталяванне можа быць потым выкарыстана і ў іншых краінах.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Сацыяльны ракурс

# ДАПАМОГА СТАЛІЧНЫМ ВЕТЭРАНАМ

**У Мінску матэрыяльная дапамога да 70-годдзя вызвалення Беларусі будзе аказана 6902 ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, а таксама асобным катэгорыям грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.**

Матэрыяльную дапамогу на агульную суму Br34 млрд выплацяць ветэранам у чэрвені ў тым жа парадку, што і пенсіі.

Грашовую дапамогу ў памеры Br10 млн акажуць героям Савецкага Саюза, кавалерам ордэнаў Славы трох ступеняў, героям Сацыялістычнай працы, удастоеным гэтага звання за заслугі ў гады ВАВ. Інвалідам і ўдзельнікам ВАВ, асобам, якія прымалі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943-1945 гадах, выплацяць па Br8 млн.

Аднаразовую матэрыяльную дапамогу ў памеры Br3,5 млн акажуць грамадзянам, узнагароджаным ордэнамі або медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады ВАВ, тым, хто ўдзельнічаў у будаўніцтве абарончых збудаванняў, хто ствараў ваенныя аб'екты, абслугоўваў прыфрантавыя ўчасткі чыгункі і аўтамабільных дарог, блакаднікам Ленінграда, членам сем'яў ваеннаслужачых, партызанаў і падпольшчыкаў, якія загінулі або прапалі без вестак падчас баявых дзеянняў у гады вайны. Па Br3,5 млн выплацяць і інвалідам з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі і калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд ВАВ або з іх наступствамі, а таксама былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны, якім устаноўлена павышэнне пенсіі на гэтай падставе.

Выплата матэрыяльнай дапамогі будзе ажыццяўляцца ў паштовых аддзяленнях горада і аддзяленнях ААТ «Беларусбанк», а таксама дастаўкай дадому з уручэннем віншавальных паштовак і памятных сувеніраў.

■

■ Акцыі

# ФУТБОЛЬНЫ МЯЧ — КОЖНАМУ ПЕРШАКЛАСНІКУ

**У краіне стартуе традыцыйная рэспубліканская акцыя «Падары дзіцяці футбольны мяч». Яе арганізатарам выступае Беларуская федэрацыя футбола пры падтрымцы Белаграпрамбанка, Міністэрства адукацыі і Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў.**

Сёлета ў рамках акцыі кожны з 19 тысяч першакласнікаў (хлопчыкаў і дзяўчатак) з 1,8 тысячы устаноў адукацыі краіны атрымаюць у падарунак футбольны мяч і змогуць далучыцца ў час летніх канікул да самага масавага віду спорту на планеце — футболу.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 30 ИЮНЯ 2014 ГОДА ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ

**по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Автомагистраль»**

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование продаваемого имущества) | машина дорожной разметки «Шмель-11А» на базе автомобиля ГАЗ-33021 (VIN XTH33021011815037) инвентарный номер 333, 2001 года выпуска, гос. № АЕ 5138-6. |
| Местонахождение продаваемого имущества | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А |
| Продавец имущества | ОАО «Автомагистраль», ул. Кижеватова, 8, 220099, г. Минск, телефон (017) 212-50-62 |
| Организатор торгов | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г.Минск |
| Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС) | 364 003 200 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 36 000 000 белорусских рублей |
| Условия аукциона | 1. Победитель торгов (покупатель) принимает имущество в состоянии как оно есть на момент продажи.<br>2. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. |

**Торги проводятся в соответствии** со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Автомагистраль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Торги проводятся 30 июня 2014 года в 16.00 по адресу:** г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 02.06.2014 по 26.06.2014 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

**ТЕЛЕФОНЫ ДЛЯ СПРАВОК:**
(017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»),
(017) 398-39-53 (ОАО «Автомагистраль»).

## Ніна БАГДАНАВА:

# «Калі я пайду ў водпуск па доглядзе дзіцяці? Я яшчэ адтуль не вярталася»

**Некаторыя памятаюць яе па эфірах на радыё «Пілот-FM», дзе яна пачынала працаваць у 2007-м вядучай музыкальна-забаўляльных праграм. Тэлегледачы ўзгадваюць праект «Зорны рынг» на тэлеканале СТБ, на якім Ніна Багданава працуе з 2009 года. Кампазітар, спявачка і вядучая, а галоўнае, шчаслівая жанчына Ніна Багданава не ведае, што такое адпачынак. Відаць, жыццё ў рытме канцэртаў, праца на тэлебачанні і выхаванне сына дзейнічаюць лепш за любы «энергетык». Вось мы і вырашылі пацікавіцца ў яе, як утрымаць шчасце ў далонях…**

***— З пазіцыі часу, праведзенага на сцэне, у эфірах радыё і тэлебачання, можаце сказаць, што вызначыліся са сваім прызваннем?***

— Шчыра, не. Мне здаецца, што я да гэтай пары ў пошуку. Таму што ў дзяцінстве я хацела стаць касманаўтам, потым марыла быць спявачкай і кампазітарам, а ў жыцці склалася так, што я запатрабавана на радыё і на тэлебачанні, таксама як вядучая розных мерапрыемстваў. Часам здаецца, быццам тое, што ў мяне лепш атрымліваецца, і ёсць маё прызванне, але хочацца рэалізаваць сябе яшчэ ў нейкім бізнесе. Я адчуваю ўласны патэнцыял, і ёсць жаданне паказаць яго на справе. Цяпер я зноў чакаю дзіця, і мы з маёй сяброўкай, дызайнерам Людмілай Лабковай (яна знаўца сваёй справы), запускаем серыю адзення для цяжарных жанчын. Бо рэальна сутыкнуліся з сітуацыяй, што ў Беларусі адзенне, якое было б прыгожым і даступным, вельмі мала. Вось буду спрабаваць сябе ў ролі бізнес-вумен.

***— На праект «Зорны рынг» вы таксама ўскладалі спадзяванні, што ён дапаможа раскрыцца…***

— Першыя сезоны мы працавалі з артыстамі міжнароднага ўзроўню — Ані Лорак, Лаліта Міляўская і шэраг іншых. Яны былі розных узростаў, markрознага прафесійнага ўзроўню і з розных краін. Паглядзець, як такія прафесіяналы працуюць на сцэне, як паводзяць сябе ў жыцці, — гэта шанцаванне. Потым былі, напрыклад, удзельнікі шоу «Спяваючыя гарады». Сёлета ўдзельнікі нашай праграмы — кавербэнды. Усе яны розныя, але робяць агульную справу, і ў кожнага з іх я нечаму вучуся, завязваю новыя знаёмствы. Напрыклад, я арганізоўваю нейкае свята, тады напрацаваныя кантакты мне дапамагаюць. Дастаткова паставіць статус у інтэрнэце — і нехта абавязкова адгукнецца. Вось такое раскрыццё…

**Не хочацца, каб маё дзіця сказала аднойчы: «Маці ўвесь час прападала на гастролях».**

***— У вас змяніўся сувядучы. Як у новым тандэме адчуваеце сябе?***

— На новы сезон праводзілі кастынг, і я думала, што заменяць мяне ў кадры, а запрасілі новага вядучага. Я па гараскопе Рыбы, таму і тут — нібы ў сваёй стыхіі. З улікам таго, што і Дзмітрый Урангель і Дзмітрый Кахно — прафесіяналы, няхай і з рознымі тэмпераментамі і падыходамі ў працы, то з новым вядучым мы хутка знайшлі агульную мову і цяпер цудоўна і зладжана працуем. Безумоўна, калі гаварыць пра Дзмітрыя Урангеля, то ён быў не проста напарнікам у эфіры, а яшчэ і маім блізкім сябрам. Мог у грымёрцы мне ўколы рабіць, калі я хварэла. А з новым вядучым адносіны падтрымліваю на ўзроўні творчых і працоўных.



***— Назіраючы за ўдзельнікамі, якія эмоцыі адчуваеце — «хварэеце» за некага альбо, можа, хочацца апынуцца на іх месцы?***

— Падчас здымак першага сезона я не берагла сіл. Бывае, здымаеш свае эпізоды і можна пайсці адпачыць, а я слухала ўсе выступленні каля сцэны. Цяпер жа з улікам таго, што аб'ём працы павялічыўся і з'явілася сям'я, больш стамляюся, таму не заўсёды прысутнічаю на музычных здымках. Аднак, варта мне з грымёркі пачуць цікавага артыста, як адразу бягу паслухаць. А так у асноўным прытрымліваюся нейтралітэту. Мне нават здаецца, сутнасць нашай праграмы не ў моманце спаборніцтва, а ў жаданні прадэманстраваць артыста, калі ён спявае жыўцом, адказвае на розныя пытанні, часам і правакацыйнага характару. Безумоўна, аналізуеш сітуацыю — падабаецца табе альбо не нейкі выканаўца. Бывае, спявак падабаецца, а пачынаеш слухаць, як ён адказвае на пытанні, і яго талент блякне, альбо, наадварот, ставішся нейтральна, а пагутарыўшы ў жыцці, знаходзіш чалавечую мудрасць, яркасць мыслення і потым просіш кампакт-дыск ці шукаеш яго песні ў інтэрнэце.

***— Калі гаварыць пра вашу музычную дзейнасць, то некаторыя лічаць, быццам вы прадказваеце лёс…***

**Пра падлеткавую злачыннасць, яе прафілактыку «Звяздзе» падрабязна распавёў Віталь ЯНЧЫН, начальнік аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх упраўлення прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў.**



***— Віталь Алегавіч, дзеці якой узроставай групы знаходзяцца ў зоне асаблівай рызыкі?***

— За 4 месяцы 2014 года ў Беларусі ў выніку злачынстваў пацярпелі больш за 2 тысячы непаўналетніх. З іх 1,8 тыс. прызнаны пацярпелымі ў выніку ўхілення бацькоў ад утрымання дзяцей ці ад пакрыцця выдаткаў, якія дзяржава выдзеліла на ўтрыманне дзяцей. Калі не ўлічваць пералічаныя злачынствы, падлеткі пераважна пакутуюць ад крадзяжоў і хуліганства. Большасць непаўналетніх ахвяр падобных здарэнняў — ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў.

***— Дарэчы, якая прадугледжана адказнасць для бацькоў, чыя няўважлівасць пацягнула сур'ёзныя наступствы для іх дзяцей?***

— Для бацькоў і іншых асоб, якія пакінулі малалетніх да 14 гадоў у небяспечным для жыцця і здароўя стане, прадугледжваецца крымінальная адказнасць. Акрамя таго, учыненне падлеткам правапарушэння таксама цягне для бацькоў негатыўныя наступствы. І калі будзе даказана, што прычынай незаконных учынкаў непаўналетніх было невыкананне абавязкаў па іх выхаванні, бацькоў прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці.

***— Што можна параіць бацькам, якія выхоўваюць маленькіх дзетак?***

— Зразумела, берагчы іх. Кожны з бацькоў адказны за сваё дзіця. Не пакідайце іх без нагляду не толькі на вуліцах, вадаёмах, у лесе, але і дома, у аўтамабілях. Гэта можа скончыцца непапраўна. Пацвярджэннем таму нядаўні трагічны выпадак. Бацька на некалькі хвілін адлучыўся і пакінуў у машыне малога сына. А хлопчык убачыў, што недалёка вадаём, выйшаў з аўтамабіля, пабег да вады і... патануў.

Прывівайце дзецям навык тэлефанаваць бацькам і казаць пра сваё месцазнаходжанне пасля ўрокаў, заняткаў у спартыўных секцыях і пасля іншых пазакласных мерапрыемстваў. Для гэтага будзьце не толькі бацькамі, але і сябрамі дзяцей. Цікаўцеся іх поспехамі. Менавіта тады яны будуць званіць вам больш ахвотна. Калі дзіця засталося дома адно, перад выхадам праверце, ці зачынены вокны. Яшчэ раз папярэдзьце, каб нікому не адчынялі дзверы. А калі нехта пазвоніць у дзверы ці па тэлефоне, парайце адказаць: «Тата і мама выйшлі да суседзяў і хутка вернуцца».

Каб зберагчы дзяцей ад злачынстваў і няшчасных выпадкаў, супрацоўнікамі органаў унутраных спраў разам з прадстаўнікамі іншых дзяржаўных устаноў праводзіцца прафілактычная работа з падлеткамі і іх бацькамі. Асабліва актыўна падобныя мерапрыемствы ладзяць напярэдадні школьных канікул і ў летні перыяд у аздараўленчых лагерах і іншых месцах масавага адпачынку. Значную дапамогу у гэтых пытаннях аказваюць настаўнікі і выхавальнікі, прадстаўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Таварыства ратавання на вадзе.

Таксама варта нагадаць, што, у адпаведнасці з артыкулам 32 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, бацькі абавязаны выхоўваць дзяцей, клапаціцца аб іх здароўі, развіцці і навучанні. Дзіця не павінна падвяргацца прыніжэнню, прыцягвацца да працы, якая можа нанесці шкоду яго фізічнаму, разумоваму ці маральнаму развіццю.

***— Многіх бацькоў клапоцяць актуальныя пытанні. Напрыклад, з якога ўзросту дзіцяці можна гуляць на вуліцы самастойна? Ці да якога часу падлеткі могуць знаходзіцца на вуліцы без суправаджэння дарослых?***

— Усё індывідуальна і залежыць ад узроўню развіцця, характару і, безумоўна, выхавання ў маладым чалавеку адчування адказнасці, здольнасцяў і навыкаў да самастойных дзеянняў у розных жыццёвых сітуацыях. На жаль, многія выхоўваюць дзяцей без спецыяльных ведаў. Таму наша парада — кансультуйцеся ў спецыялістаў.

Што тычыцца часу, дык калі падлетку няма 16, ён можа знаходзіцца на вуліцы без суправаджэння дарослых толькі да 23:00. Аналіз падлеткавай злачыннасці паказвае, што большасць правапарушэнняў непаўналетнімі ўчыняецца ноччу і ўвечары. У гэты ж час падлеткі часта самі становяцца ахвярамі злачынстваў. У гэтай сувязі з 5 верасня пазамінулага года ўведзены абавязак бацькоў па суправаджэнні непаўналетніх ва ўзросце да 16 гадоў ці па забеспячэнні яго суправаджэння паўналетняй асобай з 23:00 да 6:00 у грамадскіх месцах. Шкада, але выпадкаў, калі дзеці ноччу прадастаўлены самі сабе, яшчэ хапае. Аднак прыцягненне да адказнасці бацькоў — вымушаная мера. Кожны павінен ведаць, дзе і з кім знаходзіцца яго дзіця ў позні час. Асабліва ў перыяд канікул.

***— Між іншым, ці паніжаецца ў апошні час узровень падлеткавай злачыннасці?***

— Я лічу, што маладзёжная палітыка нашай краіны і сучасныя падыходы ў прафілактыцы правапарушэнняў прыносяць пазітыўныя вынікі. За апошняе дзесяцігоддзе колькасць злачынстваў з удзелам падлеткаў скарацілася ў 3,5 раза (з 9407 выпадкаў у 2004 г. да 2577 у 2013 г.). Падобная тэндэнцыя назіраецца і адносна ўзроўню падлеткавай злачыннасці (каля 20 злачынстваў на 10 тысяч насельніцтва ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў). Пры гэтым яна значна ніжэй, чым, напрыклад, у суседняй Расіі.

***— Якія злачынствы найчасцей здзяйсняюцца падлеткамі?***

— Крадзяжы. Аднак у апошнія гады падлеткі таксама здзяйсняюць злачынствы, якія раней былі характэрны толькі для дарослых. Напрыклад, незаконныя дзеянні, звязаныя з наркотыкамі, у галіне сучасных тэхналогій, махлярства.

Праўда, цяпер найбольш актуальнымі становяцца праблемы алкагалізацыі і наркалізацыі маладзёжнага асяродку. Да 20% ад усіх злачынстваў непаўналетнія ўчыняюць у стане алкагольнага ап'янення. Назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да «амаладжэння» спажыўцоў спіртнога. Узрост першага спажывання прыходзіцца на 12-14 гадоў. Ёсць выпадкі, калі дзеці «знаёмяцца» з алкаголем ужо ў 9-10 гадоў! На ўліку інспекцыі па справах непаўналетніх знаходзяцца больш за 4 тыс. падлеткаў за спажыванне наркатычных сродкаў і іншых адурманьваючых рэчываў, слабаалкагольных напояў ці піва.

***— Што можна аднесці да распаўсюджаных матываў злачынстваў сярод непаўналетніх?***

— Асноўнымі прычынамі злачынных паводзін непаўналетніх з'яўляюцца неспрыяльныя ўмовы ў сем'ях, недахоп у выхаванні, спажыванне алкагольных напояў, наркотыкаў, негатыўны ўплыў на падлеткаў з боку дарослых, недастатковая занятасць.

***— Цікава, а якія прафілактычныя меры міліцыі прыносяць найбольшы плён?***

— Разам з мерамі агульнай і індывідуальнай прафілактыкі значны эфект аказвае няўхільнасць пакарання. Калі аднагодкі правапарушальнікаў бачаць ці ведаюць, што за незаконныя дзеянні немінуча прыйдзе пакаранне, многія задумваюцца аб наступствах. Мы не стаім на месцы і ў плане заканадаўства. Цяпер усё часцей грамадзяне звяртаюцца да нас з-за неабгрунтаванасці, на іх думку, пастаноўкі на ўлік за здзяйсненне нязначных правапарушэнняў: безбілетны праезд, пераход вуліцы ў неналежным месцы. З іншага боку ёсць выпадкі, калі міліцыя вымушана на ўлік ставіць малалетніх ва ўзросце 5-8 гадоў, якія з-за свайго ўзросту яшчэ не могуць у поўнай ступені ўсвядоміць тое, што яны нарабілі. Каб сканцэнтраваць асноўныя меры індывідуальнай прафілактыкі ў дачыненні да падлеткаў, схільных да правапарушэнняў, МУС прапанавала ставіць на ўлік непаўналетніх у выпадку аднаразовага прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці не за ўсе правапарушэнні, прадугледжаныя адпаведным Кодэксам, а толькі за тыя, здзяйсненне якіх можа цягнуць за сабой накіраванне ў спецыяльныя вучэбна-выхаваўчыя ўстановы. У выпадку паўторнага прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці — за любое правапарушэнне, прадугледжанае Кодэксам. Пры гэтым ставіць на ўлік толькі непаўналетніх, якія дасягнулі ўзросту 10 гадоў (гэта абумоўлена тым, што ў спецыяльныя вучэбна-выхаваўчыя ўстановы, у адпаведнасці з заканадаўствам, пры наяўнасці неабходных умоў накіроўваюцца падлеткі, якія дасягнулі ўзросту 11 гадоў). Праўда, комплексная праца неабходна нам не заўтра, а ўжо цяпер. А гэта і прававыя механізмы, і выхаваўчыя, і медыцынскія, і ідэалагічныя. Толькі адна міліцыя падобную праблему самастойна не вырашыць.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

Бяспека дзяцей — таксама наш абавязак.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# БЕЗ НАРАКАННЯЎ

**Абароненасці турыстаў і непасрэдных удзельнікаў мінскага чэмпіянату свету па хакеі надавалася вялікае значэнне. «Забеспячэнне бяспекі, балельшчыкаў, журналістаў — адна з найбольш важных умоў першынства, — адзначыў на адной з прэс-канферэнцый Яўген Ворсін, дырэктар Дырэкцыі па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі. — Мы ведаем прыклады з выкраданнем спартсменаў, недружалюбнымі акцыямі, выбухамі». На шчасце, Мінск падобныя праблемы не закранулі, а спецыялісты службы бяспекі спрацавалі зладжана і надзейна. Больш падрабязна пра іх працу «Звяздзе» распавёў Дзмітрый КУР'ЯН, намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку МУС, адзін з адказных за бяспеку на «Чыжоўка-Арэне».**

— Спецыяльная падрыхтоўка нашых супрацоўнікаў да чэмпіянату свету распачалася загадзя. Мы яшчэ летась пакрысе пачалі рыхтавацца. Усе спецыялісты прайшлі неабходныя курсы па рабоце з металадэтэктарамі, працы на рамках. Нашы супрацоўнікі таксама выязджалі ў Швецыю, дзе знаёміліся з тым, як тамтэйшыя службы правапарадку працавалі на мінулым чэмпіянаце свету. А наогул вопыт падобнай працы мы ўжо мелі, істотных новаўвядзенняў не адчулі.

***— Ці валодаюць вашы супрацоўнікі замежнай мовай?***

— Менавіта такім міліцыянерам у працы на арэнах і аддавалася перавага. Усе праходзілі адпаведныя курсы замежнай мовы. Базавыя веды яны маюць, аднак карыстацца ёй многім не прыйшлося. Для непасрэднага кантактавання з гасцямі на чэмпіянаце працавалі валанцёры.

***— Балельшчыкі паспелі адзначыць, што дагляд праводзіўся даволі аператыўна.***

— Раней падобная працэдура сапраўды была крыху маруднай, але цяпер мы павялічылі колькасць прапускных пунктаў, дадаткова абучылі нашых супрацоўнікаў. Вынік адразу стаў заўважны. Людзі амаль не затрымліваліся і хутка міналі пункты пропуску.

***— За час працы на хакеі вашым супрацоўнікам прыходзілася сутыкацца з форс-мажорнымі сітуацыямі?***

— Не. Усё было даволі спакойна, і нараканняў ад заўзятараў на працу прапускных пунктаў не паступала. Кожны з разуменнем ставіўся да нашых абавязкаў. Гэта тычыцца не толькі нашых суайчыннікаў, але і балельшчыкаў з Расіі і іншых еўрапейскіх краін. Трэба адзначыць, што паміж балельшчыкамі таксама панавала дружная атмасфера. Усе весяліліся, знаёміліся, фатаграфаваліся адзін з адным на памяць. Канфліктаў заўважана не было.

***— Але на «Мінск-Арэне» чуў ад калег, што ім, каб патрапіць на стадыён, прыходзіцца пераадольваць некалькі кардонаў і кожны раз уключаць ноўтбук, фотакамеру для праверкі.***

— У законе «Аб органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь» напісана, што ўдзельнікі і наведвальнікі масавых мерапрыемстваў падлягаюць дагляду дзеля выключэння надзвычайных сітуацый. Пранос колюча-рэжучых прадметаў, балончыкаў пад ціскам, вадкасці ў тары больш за палову літра быў забаронены. Аб гэтым паведамлялася і на інфармацыйных шчытах, якія былі ўсталяваны непадалёк ад прапускных пунктаў. Для захавання вышэйпералічаных прадметаў абсталявалі спецыяльныя камеры захоўвання. Нельга было праходзіць з заплечнікамі. Жанчынам рабілі шмат заўваг наконт праносу лаку для пазногцяў, пілачак, нажнічак. Усё гэта неабходна было таксама здаваць у камеры захоўвання. Што тычыцца фотаапаратаў, нашымі супрацоўнікамі правяралася іх працаздольнасць, каб у іх абалочцы не было іншародных прадметаў.

***— Усё ж такі спецыфіка працы на чэмпіянаце адрозніваецца ад таго, чым вы займаецеся кожны дзень.***

— Безумоўна, усё гэта выходзіць за рамкі паўсядзённай дзейнасці. Але мы ўжо даўно звыкліся з практыкай правядзення масавых мерапрыемстваў. Цяжкасці дадавала толькі працяглась працы фан-зон. Яна падкідвала нам яшчэ больш работы. Праўда, нам, супрацоўнікам міліцыі, не прывыкаць.

**Якаў ЖУРБІН.**

■ Пасля службы

# СТАРЫ ГАДЗІННІК ЯШЧЭ ІДЗЕ

## Супрацоўнік міліцыі рэанімаваў ходзікі 300-гадовай даўнасці

**Людзям уласціва захапляцца чым-небудзь. Урач Сяргей Боткін, напрыклад, іграў да старасці на віяланчэлі, яшчэ адзін эскулап, Уладзімір Даль, больш праславіўся як этнограф і аўтар слоўніка, а вядомага паэта Аляксандра Блока вабіла батаніка. Вось і старшы інспектар упраўлення ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння УУС Магілёўскага аблвыканкама, падпалкоўнік міліцыі Сяргей Жвалевіч уражвае калег сваім захапленнем гадзіннікамі. Ён іх не проста калекцыяніруе — аднаўляе. Цікава, што гэтай справе міліцыянер нідзе не вучыўся. Проста яму заўсёды падабалася важдацца з рознымі складанымі механізмамі і вяртаць іх да жыцця.**



Калі заходжу ў яго службовы кабінет, нават не звяртаю ўвагі на насценны гадзіннік: сёння гэтага дабра ў крамах на любы густ. І нават вушам сваім не веру, калі падпалкоўнік называе яго ўзрост. Яшчэ больш уражвае, калі ён дастае фота і дэманструе, якім ён трапіў яму ў рукі. Такія ходзікі не шкада было б занесці на сметнік. А вось Сяргей Жвалевіч знайшоў іншае выйсце. Ён не толькі рэанімаваў ходзікі, але і даведаўся пра іх «біяграфію».

Каб даказаць, што гэта самы што ні на ёсць антыкварыят, гаспадар здымае ходзікі са сцяны і дастае гадзіннікавы механізм. На яго драўлянай аснове красуюцца дзве загадкавыя літары AD. Дакладна, што яны абазначаюць, Сяргей не ведае, але, калі меркаваць па інфармацыі з інтэрнэту, гэта таўро вядомай гадзіннікавай фірмы «AD. Mougin deux medaille». Калі ён не памыляецца, то можна сцвярджаць, што аўтар гэтага гадзінніка не хто іншы, як знакаміты брытанскі майстар Томас Шындлер, які жыў у эпоху праўлення караля Георга III. Падобныя рэчы ў тыя гады цяжка ўявіць у інтэр'еры звычайных мяшчан. Адкуль у міліцыянера такое нечуванае багацце?

> **Як высветлілася пасля экспертызы, шкло гадзінніка было самаплаўкае. Па ім спецыялісты пацвердзілі, што ўзрост рарытэта складае не менш як тры стагоддзі.**

— На жаль, дасталіся яны мне ў спадчыну не ад продкаў, — усміхаецца Сяргей. — Але іх гаспадар сапраўды быў не бедным чалавекам. Звалі яго пан Чэрнік, ён меў маёнтак у круглянскай вёсцы Дудаковічы. Мне пра яго бабуля з дзядулем расказвалі, якія якраз у гэтай вёсцы жылі. Я кожнае лета праводзіў у іх у гасцях. Якіх толькі цікавых гісторый ні чуў! І пра пана таксама. Гэты гадзіннік ён, хутчэй за ўсё, прывёз з Масквы. У інтэрнэце знайшлася інфармацыя пра тое, што ў XVIII стагоддзі падобныя завозіліся ў Белакаменную са Швейцарыі і прадаваліся на кірмашы. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1917 годзе Чэрнік збег за мяжу, пакінуўшы ўсё сваё багацце. Мясцовае насельніцтва хуценька прыбрала яго да рук. Тутэйшая бабуля Куліна, у якой я выменяў ходзікі на звычайны гадзіннік, чамусьці прыхапіла менавіта гэтую рэч.

Пра старадаўні гадзіннік цяперашні яго ўладар упершыню пачуў ад свайго бацькі Мікалая Анатольевіча. Калі той быў малы, яго здзіўляў цудоўны бой ходзікаў — яго было чуваць за некалькі двароў. Сяргея гэта так уразіла, што ён, тады яшчэ 16-гадовы падлетак, пайшоў да бабкі, каб паглядзець на незвычайную рэч. Тое, што ён пабачыў, расчаравала: звычайны насценны гадзіннік, які гаспадыня невядома нашто пафарбавала ў белы колер. Да таго ж ён нават не працаваў. Хлопец, напэўна, і забыўся б пра яго, калі б не бацька, які паабяцаў гадзіннік аднавіць. Праз год юнак, прыхапіўшы гадзіннік з фосфарным цыферблатам, зноў падаўся да суседкі Куліны. Тая нават узрадавалася, што так выгадна абмяняе не патрэбную ёй у гаспадарцы рэч. Зняла са сцяны гадзіннікавую каробку, дастала з шафы шасцярэнькі — і працягнула хлопцу. Калі і дзе згубіліся гіры, яна нават ужо і не памятала. Што рабіць з гэтым ламаччам, юнак не ведаў, а бацька аддаў увесь гадзіннікавы набор на рэстаўрацыю — у цэнтральны Дом быту ў Магілёве. Майстар адразу ж адзначыў: рэч старадаўняя.

Як высветлілася пасля экспертызы, шкло гадзінніка было самаплаўкае. Па ім спецыялісты пацвердзілі, што ўзрост рарытэта складае не менш як тры стагоддзі. Самаплаўкае шкло на працягу свайго жыцця мае ўласцівасць «аплываць». І па тым, наколькі адрозніваецца таўшчыня яго зверху і знізу, можна вызначыць, колькі яму гадоў.

У рамонце рарытэт прабыў аж два з паловай гады. Але, уздыхае суразмоўца, да жыцця яго так і не вярнулі. Дзякуй ужо за тое, што знайшлі маятнік, падобны на той, што быў страчаны. Работнік майстэрні за доўгі час так зрадніўся з гадзіннікам, што нават не вельмі хацеў яго вяртаць. Казаў, што гэты хлам немагчыма аднавіць. Але яго законнаму ўладальніку хапіла розуму забраць «хлам» дадому. Праўда, засмучаны несуцяшальным дыягназам, ён надоўга закінуў запчасткі ў шафу. Рукі дайшлі да іх амаль праз 10 гадоў.

Ён не тое каб задаўся мэтай зрабіць немагчымае — проста было цікава, як жа ўсе гэтыя шасцярэнькі сумяшчаліся адна з адной. «Для мяне гэта было нейкай гульнёй у пазлы, — смяецца Сяргей. — Калі нешта не складалася, зноў хаваў механізм у шафу. Паўгода вазіўся, але ж сабраў. Трэба было толькі праверыць, наколькі правільна ў мяне гэта атрымалася. Павесіў на сцяну, стаў падбіраць груз замест гір, якіх не было. Чапляў гантэлі, дзіцячыя металічныя машынкі, пакуль не знайшоў патрэбную вагу — амаль 5 кілаграмаў у разліку на 1 гіру. Калі гадзіннік зацікаў, я ледзь спяваць не пачаў. Не верылася, што ў мяне ўсё атрымалася. Зрабіць гіры было не праблема. Узяў некалькі звычайных балончыкаў з-пад лаку для валасоў, заліў унутр свінец ад старога акумулятара, звонку пафарбаваў прыстасаванне, зверху зрабіў зачэпкі — атрымалася выдатна. Ніхто не здагадваецца, што яны самаробныя».

Неверагоднымі намаганнямі гадзіннік атрымалася вярнуць да жыцця. Шчаслівы майстар змясціў яго на самым ганаровым месцы ў кватэры, але радасці хапіла роўна на тры дні. Кожныя паўгадзіны ходзікі білі так, што ўся шматпавярхоўка, дзе жыве сям'я Сяргея, стаяла на вушах. Прынёс свой скарб на працу, але і там ходзікі ўсіх «дасталі». Прыйшлося зняць іх і пакласці на кансервацыю.

— Вось пабудую свой дом і ў адным з пакояў зраблю невялічкі музей для гадзіннікаў, — смяецца суразмоўца. — Там яны нікому перашкаджаць не будуць.

Дарэчы, месца 300-гадовага гадзінніка заняла больш сучасная «зязюля». Голас у яе цішэй, але «ку-ку» чуваць і ў суседніх кабінетах. Супрацоўнікі прывыклі па гэтых гуках адлічваць час. А калега па кабінеце нядаўна ідэю падкінуў: нясі, маўляў, і іншыя гадзіннікі, наладзім іх на розныя часавыя паясы і будзем ведаць, колькі часу не толькі ў Мінску, але і ва Уладзівастоку, у Лондане, Нью-Ёрку.

Цікава, што гадзіннікі нібы самі знаходзяць сабе гаспадара. Інакш як можна патлумачыць тое, што яшчэ адны даваенныя «куранты» зусім выпадкова папоўнілі нядаўна калекцыю Сяргея? Калі ён ішоў з працы, убачыў, як нейкі мужчына наводзіў у двары прыватнага дома марафет і ўсе непатрэбныя рэчы выносіў за агароджу. Сярод іх аказаўся і насценны гадзіннік. Сяргей быў у грамадзянскай вопратцы, і яго інтарэс да выкінутай прэч маёмасці гаспадара не здзівіў. Высветлілася, што гадзіннік яму зусім не патрэбны, і ён нават падзякаваў нечаканаму памочніку, які і забраў сабе гэтае «смецце». Гадзіннік быў памерамі метр на паўметра. І з гэтай скрыняй было не так проста ехаць дадому ў грамадскім транспарце ў час пік. Але ж рэч таго каштавала. Пасля рамонту яна ператварылася ў адзін з прыгожых экземпляраў калекцыі.

— Няўжо вы нідзе гэтай справе не вучыліся? — не перастаю я здзіўляцца.

— Зусім не вучыўся, — смяецца майстар. — Гэта ўсё гены. У мяне бацька майстравы, усю тэхніку сваімі рукамі перабраў. Вось я з яго і бяру прыклад. Аднойчы з ручной швачнай машынкі зрабіў жонцы нажную. Усё ж такі зручней. А сёння самая вялікая мая мара — даць новае жыццё якой-небудзь старой машыне накшталт «Перамогі.» Ужо і неблагі экземпляр знайшоўся. Вось трохі разбяруся са сваімі справамі і вазьмуся за рэстаўрацыю. Спадзяюся, атрымаецца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара**

НАВІНЫ-102

## У МУС ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ ПА ХАКЕІ

**З рук міністра ўзнагароды атрымалі дзясяткі вартавых парадку.**

26 мая ў вайсковай часці 5448 адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае заканчэнню чэмпіянату свету па хакеі з шайбай. У ім прынялі ўдзел кіраўнікі Міністэрства ўнутраных спраў, ГУУС Мінгарвыканкама, асобы састаў, які забяспечваў ахову грамадскага парадку і дарожную бяспеку падчас ЧС-2014.

Падводзячы вынікі працы сваіх падначаленых, міністр Ігар Шуневіч падкрэсліў: «Упершыню такое буйнамаштабнае спартыўнае мерапрыемства было даверана нашай дзяржаве. Чэмпіянат стаў найбуйнейшым нацыянальным праектам, у якім актыўна ўдзельнічала ўся краіна, у тым ліку і мы. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў і ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў МУС унеслі вялікі ўклад у тое, каб планетарнае хакейнае першынство ў Мінску пабіла рэкорды па наведвальнасці, а яго ўдзельнікі і госці захавалі пра Беларусь толькі добрыя, яркія і цёплыя ўспаміны».

Кіраўнік ведамства падзякаваў супрацоўнікам міліцыі, у тым ліку тым, якія прыбылі з іншых рэгіёнаў краіны для аказання дапамогі сталічным калегам, за добрасумленнае выкананне службовых абавязкаў на аб'ектах правядзення чэмпіянату:

— І супрацоўнікі АМАП, і міліцыянеры патрульна-паставой службы, і інспектары ДАІ, калегі з падраздзяленняў па грамадзянстве і міграцыі, сышчыкі аператыўна-пошукавых аддзелаў і многія іншыя праваахоўнікі праявілі высокі прафесіяналізм, вытрымку, пільнасць, а таксама ветлівасць і гасціннасць у дачыненні да грамадзян Беларусі і гасцей чэмпіянату. Вашы намаганні і падрыхтоўка высока ацэнены як кіраўніцтвам краіны, так і нашымі гасцямі, — адзначыў Ігар Шуневіч.

Міністр выказаў упэўненасць, што вопыт, атрыманы ў дні падрыхтоўкі і правядзення першынства, каштоўны і пры неабходнасці паспяхова будзе прымяняцца на рэгіянальным узроўні.

Акрамя таго, словы ўдзячнасці былі адрасаваны родным і блізкім праваахоўнікаў, за іх увагу, спагаду і падтрымку падчас службы.

Пасля адбылося ўзнагароджанне тых, хто ў гэтыя дні лепш за ўсіх выканаў свой службовы абавязак. Адзін з іх — супрацоўнік АМАП УУС Брэсцкага аблвыканкама старшы сяржант міліцыі Аляксандр Грышко:

— Усё было арганізавана на вышэйшым узроўні. У сталіцу камандзіраваліся найбольш падрыхтаваныя супрацоўнікі, якія ў выніку годна справіліся з пастаўленымі задачамі. Дарэчы, з дапамогай калег мне ўдалося раскрыць крадзеж па гарачых слядах — расказаў Аляксандр. — Мы ўстанавілі і затрымалі злодзея, які «пазычыў» фотаапарат у балельшчыка з Чэхіі. Вопыт, набыты падчас першынства, безумоўна спатрэбіцца і ў далейшай службе.

**Аляксандр МАРЧАНКА.**

## НОВЫ АБАРОТ «СПРАВЫ ФЕРМЕРА»

**Як паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама, затрыманы асноўныя фігуранты, канфіскавана яшчэ 15 кілаграмаў «парашкоў» на мільёны долараў.**

Супрацоўнікам упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама ўдалося выйсці на асноўных фігурантаў, якія арганізавалі глыбока законспіраваную сетку па гандлі «спайсаў» у беларускай сталіцы. Па выніках маштабнай для краіны міліцэйскай спецаперацыі затрымана пяцёра мінчан ва ўзросце ад 24 да 33 гадоў.

Нагадаем, што ўсё пачалося некалькі месяцаў таму, калі быў затрыманы 37-гадовы менеджар адной з фермерскіх гаспадарак Мінскай вобласці, які, на думку аператыўнікаў, з'яўляўся адным з ключавых пастаўшчыкоў у беларускую сталіцу псіхатропных рэчываў. У «сховішчы», якое размяшчалася пад мостам на развязцы праспектаў Дзяржынскага і Жукава, было выяўлена каля 13 кілаграмаў парашку, з якога, па папярэдніх падліках, магло быць выраблена каля 2 тон курыльных «міксаў» і каля 2 мільёнаў так званых «марак».

Праца праваахоўнікаў працягвалася. Як растлумачыў начальнік УНіСГЛ ГУУС Канстанцін Ляшкевіч, у аператыўнікаў была інфармацыя аб тым, што напярэдадні і падчас правядзення ў Мінску чэмпіянату свету па хакеі плануецца пастаўка ў горад з Расійскай Федэрацыі буйной партыі парашкоў для вытворчасці курыльных сумесяў і сумна вядомых «марак». Рэалізоўваць смяротны тавар дылеры планавалі праз інтэрнэт, выкарыстоўваючы пры гэтым «тайнікова метад» і дробных распаўсюджвальнікаў.

Гэтай інфармацыяй заняліся неадкладна. У выніку на працягу некалькіх дзён было затрымана пяць мінчан, з іх двое — асноўныя арганізатары наркабізнесу (у інтэрнэце пазіцыявалі сябе пад нікамі «Віця» і «Жора»). Апошніх падазраюць не толькі ў «камерцыйных» сувязях з даволі вядомым «фермерам», але і ў стварэнні на тэрыторыі Мінска шырокай сеткі па распаўсюджванні «спайсу» і яго вытворных («маркі», «хуткасць» і г.д.).

Пры аглядзе боксаў у гаражных кааператывах у пасёлку Лясны (Мінскі раён) і па вуліцы Алёшына ў Мінску, якія арандавалі затрыманыя, аператыўнікамі было канфіскавана 14 кілаграмаў «парашку» і 2 кілаграмы гатовых курыльных «міксаў». Як адзначаюць спецыялісты, калі б групоўка змагла ператварыць усю партыю — а гэта больш за 15 кілаграмаў адных толькі «парашкоў» — у гатовы «тавар», то агульная колькасць разавых доз перавысіла б паўтара мільёна штук! Кошт жа канфіскаванага ў цэнах «чорнага» рынку склаў больш за пяць з паловай мільёнаў долараў.

І гэта не кажучы пра дзясяткі, сотні і нават тысячы маладых жыццяў, якія маглі б забраць гэтыя «маркі». На жаль, прыклады таму ўжо ёсць, і яны не адзінкавыя...

## «НА АБАРОНЕ БУДУЧАГА ПАКАЛЕННЯ»

**Сёння ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці сталіцы пройдзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання намінантаў і лаўрэатаў II-га рэспубліканскага конкурсу дзіцячых малюнкаў і фатаграфій прававой накіраванасці.**

Наглядна прадэманстраваць ролю права ў жыцці падрастаючага пакалення ўжо другі год прапануе ўсім ахвотным ад 10 да 18 гадоў Міністэрства ўнутраных спраў, Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі, грамадскае аб'яднанне «Дзеці не для гвалту».

Мэтай конкурсу, прымеркаванага да 20-годдзя прыняцця Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці», з'яўляецца папярэджанне супрацьпраўных паводзін, прафілактыка шкодных звычак і фарміраванне здаровага ладу жыцця.

У заключным рэспубліканскім этапе конкурсу прынялі ўдзел больш за сто работ, прызнаных лепшымі па выніках абласных адборачных тураў. Журы было ўражана багаццем разнастайных выяўленчых тэхнік і смелых аўтарскіх ідэй, увасобленых на паперы юнымі талентамі, якія пастараліся данесці дарослым сваё бачанне прававой тэмы.

Акрамя прызавых месцаў, журы конкурсу адзначыла яшчэ шаснаццаць работ, аўтары якіх будуць запрошаны ў Мінск для ўзнагароджання дыпломамі і памятнымі прызамі. На ўрачыстай цырымоніі гасцей чакаюць святочны канцэрт і шмат станоўчых эмоцый ад выстаўкі лепшых работ. Пераможцам уручаць каштоўныя падарункі. Праграмай запланаваны таксама экскурсія і салодкі стол у музеі МУС.

**Ірына ТУРОК.**

## ПРИГЛАШЕНИЕ
## на участие в торгах методом переговоров

**Организатор торгов ОДО «САЛЕЙ»** приглашает принять участие по выбору подрядной организации на монтаж коробки здания из изделий КПД серии 90М Бр объекта в г. Минске «Многоквартирный жилой дом по генплану № 13 по ул. Грушевской в г. Минске».

Стоимость строительно-монтажных работ в текущих ценах ориентировочно составляет 31 200 млн. руб.

Переговоры будут проведены 03.06.2014 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43А, к. 22.

Срок представления документов до 02.06.2014 г.

По результатам переговоров с победителем будет заключен договор подряда.

**КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН – (017) 256 25 83.** *УНП 690372371*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 30 ИЮНЯ 2014 ГОДА ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ

**по продаже единым комплексом имущества, принадлежащего ОАО «Стройтрест № 4» и расположенного по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 12А**

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества) | «Здание электромеханической мастерской (литер 2/к-жб)» общей площадью 1306 кв. м (с составными частями и принадлежностями), инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-24309, адрес: г. Минск, ул. Уручская, 12а;<br>«Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей» общей площадью 841,8 кв. м, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-37749, адрес: г. Минск, ул. Уручская, 12А/6<br>«Цех электрозаготовок» общей площадью 543 кв. м, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-37751, адрес: г. Минск, ул. Уручская, 12А/2;<br>«Хранилище» общей площадью 351,8 кв. м, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-37752, адрес: г. Минск, ул. Уручская, 12А/9;<br>«Склад» общей площадью 441,4 кв. м, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-38573, адрес: г. Минск, ул. Уручская, 12А/13;<br>«Склад» общей площадью 18,9 кв. м, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-38574, адрес: г. Минск, ул. Уручская, 12А/1;<br>«Бытовое здание» общей площадью 19,3 кв. м, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-38575, адрес: г. Минск, ул. Уручская, 12А/11;<br>«Контрольно-пропускной пункт» общей площадью 59,7 кв. м, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-38576, адрес: г.Минск, ул. Уручская, 12А/12. |
| Сведения о земельном участке | Площадь – 1,6788 га, кадастровый номер 500000000009003549, назначение – земельный участок для эксплуатации зданий и сооружений производственной базы |
| Продавец имущества | ОАО «Стройтрест № 4», ул. Коммунистическая, 17, 220002, г. Минск |
| Организатор торгов | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| Начальная цена предмета торгов (без учета НДС) | 20 025 395 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 2 000 000 000 белорусских рублей |
| Наличие обременений | Аренда |
| Условие аукциона | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. |

**Торги проводятся в соответствии** со стст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Стройтрест № 4», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Торги проводятся 30 июня 2014 года в 15.00 по адресу:** г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 29.05.2014 по 26.06.2014 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. аркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:** (017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»), (017) 334-26-64 (ОАО «Стройтрест № 4»).

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 30 июня 2014 года в 11.00 по адресу:** 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, конференц-зал.

Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Могилевского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12.

**На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:**

| № лота | Площадь, предлагаемая в аренду, кв.м/ Коэффициент по п. 8.2. | Начальная цена лота, БАВ/рублей | Размер задатка, БАВ/рублей |
|---|---|---|---|
| **Помещения на 4-ом этаже в изолированном помещении (помещение связи) общей площадью 529,2 кв. м по ул. Турова, 1–2 в г. Могилеве Могилевской области** | | | |
| 1. | 37,1 кв. м / 1 | 9,275/946050 | 0,9275/94605 |
| 2. | 15,4 кв. м / 1 | 3,85/392700 | 0,385/39270 |
| 3. | 21,9 кв. м | 5,475/558450 | 0,5475/55845 |
| 4. | 36,6 кв. м / 1 | 9,15/933300 | 0,915/93330 |
| 5. | 15,4 кв. м / 1 | 3,85/392700 | 0,385/39270 |
| 6. | 20,5 кв. м / 1 | 5,125/522750 | 0,5125/52275 |
| 7. | 15,5 кв. м / 1 | 3,875/395250 | 0,3875/39525 |
| 8. | 20,3 кв. м / 1 | 5,075/517650 | 0,5075/51765 |
| 9. | 35,2 кв. м / 1 | 8,8/897600 | 0,88/89760 |
| 10. | 23,6 кв. м / 1 | 5,9/601800 | 0,59/60180 |
| 11. | 12,1 кв. м / 1 | 3,025/308550 | 0,3025/30855 |
| 12. | 176,4 кв. м / 1 | 44,1/4498200 | 4,41/449820 |
| 13. | 99,2 кв. м / 1 | 24,8/2529600 | 2,48/252960 |

Шаг аукциона – 5%, срок аренды – не менее 3-х лет.

**Цель использования:** для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офисов, складских помещений, для оказания услуг.

Документы на участие в аукционе принимаются с 30.05.2014 по 27.06.2014 (с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням) по адресу: г. Могилев, ул. Ленинская, 12, каб. 401. Документы, поданные после 16.00 27.06.2014, не рассматриваются.

Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 10.00 по адресу: г. Могилев, ул. Ленинская, 12, каб. 401.

**Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:**

– перечисляет задаток на с/с 3012200007522 в филиале № 700 Могилевского областного управления АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700838273, Могилевский филиал РУП «Белтелеком»;

– подает заявление на участие в аукционе;

– заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

– предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

**Помимо указанных документов:**

– физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;

– индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;

– юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию;

– нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:**

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды:

Участник аукциона, ставший победителем аукциона (единственным участником аукциона), уплачивает штраф в размере 15% от начальной цены продажи Объекта.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона уплачивает штраф в размере 15% от начальной цены продажи Объекта.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

**Контактные телефоны: 8 (0222) 29 21 33, 29 22 13, факс 22 85 47.**

## Ваша бяспека

# У НАВУШНІКАХ МОЖНА НЕ ПАЧУЦЬ ЦЯГНІК

**З 30 мая па 8 чэрвеня Беларуская чыгунка праводзіць дэкаду па папярэджанні дзіцячага траўматызму.**

Работнікі магістралі правядуць растлумачальна-прафілактычныя гутаркі ў працоўных калектывах прадпрыемстваў і ўстаноў адукацыі. Асаблівая ўвага будзе нададзена тлумачэнню недапушчальнасці знаходжання непаўналетніх на чыгуначных пуцях у навушніках і вядзення перамоў з выкарыстаннем сродкаў мабільнай сувязі. Таксама будуць дадаткова праінструктаваны лакаматыўныя брыгады аб павышэнні пільнасці пры набліжэнні да пасадачных платформаў, пераездаў і месцаў магчымага з'яўлення людзей. У перыяд летніх канікул прафілактычныя гутаркі з непаўналетнімі запланаваны ў дзіцячых аздараўленчых лагерах, размешчаных у непасрэднай блізкасці ад чыгункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

**ГРОДНЕНСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ**

Комплекса зданий и сооружений по адресу: г. Волковыск, ул. Советская, 64 с начальной ценой продажи 3 804 107 400 (три миллиарда восемьсот четыре миллиона сто семь тысяч четыреста) белорусских рублей с учетом НДС. Аукцион состоится 12 июня 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.

Извещение о проведении аукциона было размещено в газете «Звязда» от 10.05.2014 г.

**ИЗВЕЩАЕТ о внесении изменений в объявление о проведении аукциона, размещенном в газете «Звязда» от 10.05.2014 г. и установить последний день приема заявлений – 6 июня 2014 г. до 15.00.**

***Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»***

*УНП 500833225*

Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

**сообщает о предстоящем проведении аукциона**

(июль 2014 г.)

на право заключения договора аренды земельного участка площадью 2,4 га для строительства бизнес-центра с гостиницей и подземным паркингом на территории Национального аэропорта «Минск».

**ТЕЛЕФОН ДЛЯ СПРАВОК 226-16-72.** *УНП 190398583*

## ПРЕДЛОЖЕНИЕ
### о скупке акций ОАО «ЗОРИНА»

**Полное наименование и местонахождение Покупателя акций:** Совместное общество с ограниченной ответственностью «Либретик», Республика Беларусь, г. Минск, пр. Победителей, д. 89, корп. 1., пом. 4, комн. 39. **Тел. +375 17 334-69-91.**

**Брокер покупателя:** Общество с ограниченной ответственностью «Андес Капитал», г. Минск, ул. Я. Чечота, д. 28 пом. 35.

**Полное наименование и местонахождение эмитента, акции которого покупаются:** Открытое акционерное общество «Зорина», 220125, г. Минск, пр. Независимости, дом 181.

**Количество акций, которое намеревается приобрести Покупатель:** 15 160 (Пятнадцать тысяч сто шестьдесят) штук простых (обыкновенных) акций.

**Цена приобретения акций:** 2 850 000 (Два миллиона восемьсот пятьдесят тысяч) белорусских рублей за одну акцию.

**Сроки, форма и порядок оплаты акций:** оплата будет производиться денежными средствами в белорусских рублях безналичным перечислением на счет брокера-продавца в день заключения сделки согласно требованиям расчетно-клиринговой системы ОАО «БВФБ».

**Место совершения сделок:** ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа», г. Минск, ул. Сурганова, 48а.

**Дата начала покупки акций:** «16» июня 2014 года.

**Дата окончания покупки акций:** «01» августа 2014 года.

*УНП 101454161*

## Супрацоўніцтва

# «САЮЗНАЯ ПРЫБОРКА»

**Акцыя па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні пад такой назвай пройдзе ў адзіны дзень на тэрыторыі адразу трох дзяржаў — Беларусі, Расіі і Казахстана.**

Правядзенне гэтай маштабнай акцыі ініцыявала Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя нашай краіны. Па выніках сустрэчы міністраў прыродаахоўных ведамстваў Беларусі, Расіі і Казахстана было прынята рашэнне, у якім фармаце пройдзе «саюзнае добраўпарадкаванне». Таксама быў вызначаны адзіны дзень — 5 чэрвеня (дата сімвалічная для эколагаў і ўсіх неабыякавых да экалагічных праблем — Сусветны дзень навакольнага асяроддзя).

«У прыроды няма межаў, экалагічныя праблемы актуальныя для ўсіх дзяржаў свету. І, плануючы правядзенне акцыі, хочам яшчэ раз падкрэсліць, што, з'яўляючыся членамі розных інтэграцыйных аб'яднанняў — Саюзнай дзяржавы, Мытнага саюза, мы гатовы вырашаць усе праблемы разам, у тым ліку і экалагічныя», — гаворыцца ў паведамленні Мінпрыроды.

У нашай краіне да акцыі далучыліся практычна ўсе міністэрствы і ведамствы, а таксама падпарадкаваныя ім арганізацыі. У ёй будуць удзельнічаць калектывы школ, тэатраў, буйных прамысловых прадпрыемстваў, асабовы склад воінскіх часцей.

У гэты дзень работнікі ведамстваў, арганізацый і прадпрыемстваў выйдуць на добраўпарадкаванне тэрыторый. Але найперш, улічваючы, што распачынаецца летні сезон, увага ўдзельнікаў акцыі будзе накіравана на месцы масавага адпачынку — паркі, пляжы, прыбярэжныя тэрыторыі вадаёмаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

**БЕЛАРУСБАНК**

**ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует, что с 30 мая 2014 года процентные ставки по вновь принимаемым срочным банковским вкладам (депозитам) физических лиц в белорусских рублях установлены в следующих размерах:**

– «Приоритет» – в размере 33% годовых;

– «Гарантированный доход»:

– сроком на 15 дней – в размере 23% годовых;

– сроком на 35 дней – в размере 29% годовых; (по ранее принятым на указанные сроки вкладам «Гарантированный доход» установленный размер процентной ставки применяется с даты автоматического перезаключения на новый срок, начиная с 30.05.2014);

– «Интернет-депозит-Презент» – основной доход в размере 32% годовых (по ранее принятым вкладам, по которым не нарушена срочность, установленный размер процентной ставки применять, начиная с 30.06.2014);

– «Четыре сезона» – основной доход в размере 33% годовых (по ранее принятым вкладам, по которым не нарушена срочность, установленный размер процентной ставки применять, начиная с 30.06.2014);

– «Интернет-депозит» – основной доход в размере 35% годовых (по ранее принятым вкладам, по которым не нарушена срочность, установленный размер процентной ставки применять, начиная с 30.06.2014);

– Накопительный – основной доход в размере 28% (по ранее принятым вкладам, по которым не нарушена срочность, установленный размер процентной ставки применять, начиная с 30.06.2014).

С 30.05.2014 установлена процентная ставка по вновь оформляемым сберегательным сертификатам со сроком обращения 1 месяц – в размере 30% годовых, 2 месяца – в размере 31% годовых.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

**Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продаже капитального строения, находящегося в собственности ОАО «Пошив и ремонт обуви» 30 июня 2014 года

| № лота | Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь) | Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб. (без учета НДС) | Размер задатка, бел. руб. | Характеристика объекта | Условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-75787 общей площадью 471,0 кв.м, расположенное в г. Могилеве, по ул. Челюскинцев, 76 | 869 300 000 | 43 465 000 | 2-этажное административно-хозяйственное здание. Фундамент – бетонный; стены – кирпичные, блоки облицованные кирпичом; перекрытия – железобетонные; перегородки – кирпичные; крыша – рубероид; полы – дощатые, плиточные, бетонные; проемы оконные – двойные окрашены, дверные – простые. Имеется центральное отопление, водопровод, канализация, электроосвещение, радио, телефон | Без условий |

**Аукцион состоится 30 июня 2014 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу:** г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

Заявки принимаются ежедневно с 30 мая 2014 в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.

**Последний день приема заявлений и внесения задатка – «26» июня 2014 года до 17.00.** Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

Заключительная регистрация участников аукциона **30 июня 2014 года с 14.00 до 15.00.**

Продавец предмета аукциона – ОАО «Пошив и ремонт обуви», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 76, контактные телефоны – 22-20-39, 70-39-86.

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны – 22-21-78, 22-00-89.

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектами, к которым прилагаются:

**- документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» 3012430089016, Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, МФО 153001739, УНН 700008710 с отметкой банка;

**- юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

